

ЯК СВЯТКАВАЦЬ ВЯЛІКДЗЕНЬ

Сямейная газета

ЕЖА – АПОШНЯЕ, НА ЧЫМ ТРЭБА ЭКАНОМІЦЬ

Сямейная газета




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 КРАСАВІКА 2023 г. ЧАЦВЕР № 65 (29945)


## КОРАТКА

• **Беларусь за два месяцы экспартавала прадуктаў харчавання і сельгассыравіны на $1,2 млрд.**

• Заяўкі на работу ў студэнцкіх атрадах падалі амаль 13 тыс. чалавек.

• **Гродзенскі «Нёман» абыграў «Юнацтва» ў пятым матчы паўфіналу Кубка Прэзідэнта.**

• Адзін з найстаражытнейшых дакументаў у гісторыі горада, падавецкую грамату 1681 года, прэзентавалі ў Гомелі.

• **Запас азотных і фосфарных угнаенняў у Беларусі сёлета на 15 % перавысіць леташні.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар БРЫЛО, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«У ходзе фінансавання меліярацыйных мерапрыемстваў 2023 года будуць праведзены работы па аднаўленні меліярацыйных сістэм на плошчы 110 тысяч га (павелічэнне ў чатыры разы ў адносінах да 2021 года). Паводле ацэнкі вучоных, пры рэканструкцыі меліярацыйных сістэм на гэтай плошчы, а таксама выкананні землекарыстальнікамі патрабаванняў тэхналагічных рэгламентаў вырошчвання сельгаскультур, распрацаваных у НАН Беларусі, будзе забяспечана павелічэнне іх ураджайнасці ў 1,3—3 разы ў залежнасці ад выходнай ступені зносу сістэм. У выніку дадатковы ўраджай за пяць гадоў складзе каля 10 млн цэнтнераў кармавых адзінак. У эквіваленце гэта прыкладна 1 млн тон малака».*

# З РАБОЧЫМ ВІЗІТАМ ПА ВАЖНЫХ ПЫТАННЯХ




Фота БелТА.

**Учора ўвечары Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыляцеў з рабочым візітам у Расійскую Федэрацыю.**

Напярэдадні пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, якое пройдзе сёння, Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін правялі асобную двухбаковую сустрэчу. На ёй прэзідэнты разгледзелі шырокі спектр пытанняў беларуска-расійскіх адносін, уключаючы тыя, якія не падлягаюць абмеркаванню на ВДС. Імпартазамяшчэнне, паглыбленне кааперацыі, развіццё высокатэхналагічных галін. Сярод тэм была і міжнародная абстаноўка, меры па ажыццяўленні бяспекі.

Сёння ў Маскве Аляксандр Лукашэнка прыме ўдзел у пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы. Удзельнікі мерапрыемства разгледзяць ход выканання Асноўных напрамкаў рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2021-2023 гады і саюзных праграм. Яшчэ адна ключавая тэма — распрацоўка Канцэпцыі бяспекі Саюзнай дзяржавы.

Традыцыйна частка пытанняў парадку дня ВДС будзе звязана з бягучай дзейнасцю ў рамках Саюзнай дзяржавы. На пасяджэнні падвядуць вынікі і абмяркуюць сумесную работу на наступны перыяд.

*Падрабязна аб двухбаковай сустрэчы лідараў і аб пасяджэнні ВДС — ужо сёння на нашым сайце zviazda.by і ў заўтрашнім нумары газеты.*

Спецыяльны рэпартаж

# ВАДА ВЯДЗЕ

## Карэспандэнт «Звязды» хадзіла па цэнтры Гомеля ў вадалазным касцюме

**У Гомелі «плюсуе» вялікая вада. За апошнія суткі яе ўзровень на рацэ Сож на тэрыторыі абласнога цэнтра дасягнуў адзнакі ў 565 сантыметраў і перавысіў небяспечна высокі парог на 65 сантыметраў. З-за паводкавай сітуацыі даволі напружаная абстаноўка ў прыбярэжнай гарадской тэрыторыі ў раёне вуліцы Палявой. Вада з рачной поймы тут актыўна адваёўвае ў сушы агароды, падворкі, жылыя дамы і ўчасткі дарог агульнага карыстання. Для бяспекі руху людзей спатрэбілася дапамога ратавальнікаў: арганізаваны пост супрацоўнікаў МНС з плыўсродкам. «Вулічным фарватарам» прайшла і карэспандэнт «Звязды».**

### Гумовікі як самы хадавы аксесуар

Прыватны сектар Якубоўкі, што на тэрыторыі Навабеліцкага раёна Гомеля, перыядычна ператвараецца ў Венецыю. Падворкі мясцовых жыхароў — зусім блізка ад поймы Сожа. Сёлета наравісты характар ракі гаспадары тутэйшых дамоў адчулі ў поўнай меры. Цяпер у жылой зоне свае законы людзям дыктуе стыхія. Перасекчы значную частку дарогі па цэнтральнай вуліцы Палявой можна толькі на лодцы альбо пешшу ў рыбацкім камбінезоне.

СТАР. 4



Па палічках

# БЛАКІТНАЕ ПАЛІВА Ў ЖЫЛЛІ

## Эксперты расказалі, як беларусам карыстацца газам і плаціць за яго

**Сёлета ў Беларусі мусяць пракласці больш за 200 кіламетраў газаправодаў да сельскіх населеных пунктаў — газ з'явіцца яшчэ мінімум у 50 мястэчках і вёсках. На сённяў краіне газіфікавана 118 райцэнтраў, 115 гарадоў, 85 гарадскіх, рабочых і курортных пасёлкаў, а працягласць газавых сетак — 66,5 тысячы кіламетраў — гэта паўтары даўжыні экватара Зямлі. Плаціць за газ спажыўцы будуць па такіх жа правілах, як і летась. Аб планах, новаўвядзеннях, тарыфах і бяспечнай эксплуатацыі газу расказалі эксперты галіны.**



### А ў нас у хаце газ

Апошнія 60 гадоў газіфікацыя ў Беларусі вядзецца пастаянна. Гэта паспяховая работа не аднаго пакалення газавікоў, таму сярод краін былога СССР наша дзяржава займае лідзіруючыя пазіцыі, расказаў **Сяргей КУДРАВЕЦ, начальнік упраўлення капітальнага будаўніцтва Белпаліўгаза:**

*— З 1960-х да 1990-х гадоў было збудавана каля 10 тысяч кіламетраў газаправода, а з моманту асабліва актыўнай газіфікацыі (з 1994 года) — каля 50 тысяч. Пасля газіфікацыі асноўнай масы гарадоў і буйных пасёлкаў увага скіравалася на забеспячэнне газам сельскай мясцовасці. З 23 027 сельскіх пасёлкаў газіфікавана больш за 3,6 тысячы мястэчак (або амаль 16 %) і 1009 (70,6 %) аграгарадкоў, якіх усяго ў краіне 1430. Падача блакітнага паліва сёння наладжана ў больш як тры мільёны кватэр (83 % жылля) і 49,1 % жылля ў сельскай мясцовасці.*

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

23065

Абмяркоўваем Пасланне Прэзідэнта

# ЗАХАВАЦЬ МІР І БЯСПЕКУ НА РОДНАЙ ЗЯМЛІ МЫ МОЖАМ ТОЛЬКІ ЎСЕ РАЗАМ

**Іван КУБРАКОЎ, міністр унутраных спраў, генерал-лейтэнант міліцыі:**



— У Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Прэзідэнт удзяліў увагу ўсім напрамкам жыцця грамадства. Але галоўнай тэмай, безумоўна, стала захаванне і ўмацаванне суверэнітэту і незалежнасці нашай дзяржавы. А гэта сфера адказнасці і сілавых структур.

«Чым больш мы хочам жыць у мірнай суверэннай дзяржаве, тым мацнейшымі мы павінны быць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Нам, людзям у пагонах, пастаўлена задача што б там ні было захаваць мір на беларускай зямлі. Мы робім тое і гатовыя да розных сцэнарыяў развіцця падзей. Улічваючы практыку іншых краін, а таксама вопыт, набыты намі ў 2020 годзе, адпрацоўваем на вучэннях узаемадзеянне падраздзяленняў МУС пры спыненні спроб нападзення на населены пункт, захопу крытычна важных аб'ектаў, абясшкоджванні і затрыманні ўдзельнікаў незаконных узброеных фарміраванняў. Асаблівую ўвагу пры гэтым удзяляем забеспячэнню бяспекі грамадзян. Ужо паспелі ацаніць многія перавагі беспілотных лятальных апаратаў, якія з'яўляюцца важнай падмогай для кантролю за аператыўнай абстаноўкай. Ды і ў цэлым, ідучы ў нагу з часам, укараняем у работу розных службаў новыя тэхнічныя сродкі.

Як паказваюць апошнія падзеі, у прыватнасці ў Мачулішчах, міліцыянеры і ваеннаслужачыя ўнутраных войскаў павінны быць гатовыя дзейнічаць у любы час сутак на любой тэрыторыі. Для выканання ж асаблівых задач ствараем спецыяльныя падраздзяленні. Такія рашэнні дыктуюць час і абстаноўка вакол нашай краіны. Напрыклад, байцы сфарміраванага ў канцы мінулага года асобнага атрада спецыяльнага прызначэння «Рысь» з першых дзён акунуліся ў работу ў прыгранiччы з Украінай, забяспечвалі падтрымку аператыўнікам, разам з калегамі з падраздзяленняў МУС і іншых сілавых ведамстваў не далі ўцячы з Беларусі выканаўцу тэракта ў Мачулішчах.

Хацеў бы запэўніць грамадзян нашай краіны: органы ўнутраных спраў, унутраныя войскі гатовыя і далей прыкладаць усе намаганні, каб дастойна і эфектыўна супрацьстаяць праявам тэрарызму і экстрэмізму, усім выклікам і пагрозам, забяспечваць правапарадак, бяспеку людзей і мірнае неба над галавой. Але захаваць мір і бяспеку на роднай зямлі мы можам толькі ўсе разам. Аб гэтым таксама неаднаразова гаварыў Прэзідэнт. У сённяшні неспакойны час мы павінны быць пільнымі, рабіць усё для таго, каб спрацаваць на апярэджанне і не дапусціць здзяйснення на нашай тэрыторыі тэрарыстычных актаў і іншых злачынстваў. Для гэтага неабходна, каб кожны грамадзянін краіны разумеў, наколькі важна своечасова інфармаваць органы ўнутраных спраў і іншыя кампетэнтныя органы аб найменшай небяспецы, падазроных асобах і прадметах. Такое адзінства — залог таго, што нашы вуліцы будуць і надалей заставацца мірнымі і бяспечнымі.

**Ірына СТАРАВОЙТАВА, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:**



— Прэзідэнт, як заўжды, вельмі адкрыты ў звароце да народа. І гэтая адкрытасць, шчырасць і перажыванне за тое, што адбываецца на ўнутры- і знешнепалітычнай арэне, заўсёды вельмі падкупляе. Перыяд вельмі няпросты. Улічваючы знешнепалітычныя працэсы, якія адбываюцца і звязаныя з ваенным нагнятаннем на знешніх рубяжах, умацаванне бяспекі лейтматывам праходзіла праз усё пасланне. Стала зразумела, што робіцца ў нашай краіне для ўмацавання на знешніх граніцах, у ваенна-палітычных адносінах і якія былі прынятыя рашэнні ўнутры Беларусі для ўмацавання стабільнага развіцця і паляпшэння якасці жыцця нашага насельніцтва.

Прэзідэнт закрануў і сацыяльную сферу. На прыкладзе шматдзетных сем'яў ён адзначыў: вельмі важна, каб усе льготы, якія атрымліваюць людзі, даходзілі да таго самага канкрэтнага дзіцяці.

Вельмі важныя моманты Прэзідэнт акрэсліў і адносна выхавання моладзі, адзначыўшы, што толькі сапраўдны патрыёт сваёй краіны можа выхаваць патрыёта. Звяртаючы на гэта ўвагу, мы разумеем, што тут вельмі важныя не толькі змястоўныя аспекты (навучальныя дапаможнікі і змест выкладання), але і тое, хто выкладае. Што датычыцца сістэмы адукацыі, Прэзідэнт яшчэ раз звярнуў увагу, што ў нас досыць якасная адукацыя, гэта пацвярджаецца ў тым ліку тым, што да нас едуць вучыцца замежныя грамадзяне з вялікай колькасці краін.

Увогуле кіраўнік дзяржавы закрануў практычна ўсе магчымыя пытанні. У навуковай сферы, напрыклад, гэта неабходнасць інтэграцыі навуковых распрацовак у прамысловую сферу. Нам неабходна рабіць тое як мага хутчэй і ствараць новыя вытворчасці, прадпрыемствы і рабочыя месцы, бо Прэзідэнт найперш думае пра дабрабыт краіны і народа, які ў ёй жыве. І гэта адчувалася і было відаць па эмоцыях, якія выказваў Прэзідэнт. Гэта адчувала ўся зала.

**Дзмітрый ГАДУН, ваенны камісар Мінскага раёна:**



— Мне пашчасціла ўдзельнічаць у такім значным мерапрыемстве, як выступленне Прэзідэнта з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу. З першых хвілін гэтага выступлення кіраўнік нашай дзяржавы адзначыў, што наш народ адзіны. «Народнае адзінства — першая ўмова захавання суверэнітэту і незалежнасці», — падкрэсліў Прэзідэнт. І гэта дае цвёрдую ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

Квінтэсенцыяй Паслання былі суверэнітэт і незалежнасць беларускай дзяржавы. Здаецца, звычайныя словы, але якім глыбокім сэнсам яны напоўнены! Гэта мір, гэта наша нацыянальная бяспека, гэта наш дабрабыт.

Для мяне як для ваеннага чалавека словы Прэзідэнта аб абароне дзяржавы і нацыянальнай бяспецы маюць асаблівае значэнне. Я хачу запэўніць нашых людзей, што кожны з ваеннаслужачых Беларусі выканае свой воінскі абавязак без сумненняў, вырашыць усе задачы, якія належаць яму па прызначэнні. Адпаведна статутам і беларускім законам.

«Беларусь — краіна міралюбівая. Мы не збіраемся ні з кім ваяваць, ні на кога нападаць. Мы будзем абараняць мір, а не знішчаць яго. Любы замах на суверэнную тэрыторыю Беларусі атрымае неадкладны адказ, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мы будзем захоўваць і забяспечваць суверэнітэт і незалежнасць чым толькі магчыма, у тым ліку і ядзерным арсеналам». Думаю, што пасля гэтых слоў самыя гарачыя галовы заходніх палітыкаў хутка астынуць.

А яшчэ лічу вельмі важным, што Прэзідэнт аддаў увагу ў Пасланні сямейным каштоўнасцям. Ён нагадаў, што дзяржава будзе працягваць падтрымку шматдзетных сем'яў. Закрануў шэраг эканамічных пытанняў, вызначыў прыярытэты эканамічнага развіцця. І адзначыў, што, адпаведна з Канстытуцыяй, галоўным прынцыпам нашай палітыкі з'яўляецца сацыяльная справядлівасць. І мы будзем цвёрда прытрымлівацца яго, што б ні адбывалася ў свеце.

**Падрыхтавалі Вераніка КАНЮТА, Ірына СІДАРОК, Сяргей РУЧАНАЎ.**

По сутнасці

# ГАЛОЎНЫЯ СЛОВЫ



**«З цэлым народам гутарку весці, сэрца мільёнаў падслухаць біцця. Гэткай шукаю цэлы век чэсці, гэта адно мне падпорай жыцця», — так думаў і пісаў Купала. Так намагаецца рабіць наш Прэзідэнт. У працытаванага твора класіка вельмі лірычная назва і яе знакавы пасыл — «З кутка жаданняў». Той куток мы стварылі. А вось цяпер яго трэба зберагчы. Так стараецца рабіць Прэзідэнт. Яскравы прыклад — Пасланне беларускаму народу і парламенту. Гэта ўзор самай прамой і адкрытай дэмакратыі. Падвесці вынікі, акрэсліць задачы, смела прызнацца ў недахопах. Памятаеце, як у пачатку нашай Незалежнасці палітычную рэчаіснасць адлюстроўваў паэтычны пасыл — «усё ж мы дойдзем, дойдзем мы да Беларусі». Дайшлі. І каб рухацца далей, трэба ведаць, у якім напрамку. Вось увесь гэты шлях і адлюстравала прамова Прэзідэнта. У беларускай палітычнай культуры — звыклая справа. Падзея штогадовая.**

З вялікай цікавасцю за выступленнем кіраўніка Беларусі назіралі і ў розных кутках нашай краіны, і ў многіх іншых дзяржавах. Бо менавіта наш Прэзідэнт кажа праўду і прапануе самыя смелыя ідэі. Чаму ўплыў прамовы, звернутай да беларусаў, выходзіць за межы нашай краіны? Таму што, як заўжды, Беларусь у рэчышчы геапалітычных працэсаў. Такі лёс нам вызначыла геаграфічнае становішча. І беларускі лідар прапануе свету прадукцыйную мадэль развіцця. Дзе ў будучыні ёсць месца розным краінам, рэлігіям, культурам. Дзе ў будучыні ёсць месца мужчыне і жанчыне. Дзе ў будучыні ёсць месца біблейскаму Чалавеку.

Галоўнае ж — застацца гаспадарамі ў сваёй хаце. Незалежнасць — гэта магчымасць застацца ў Гісторыі. Эмацыянальнае, пранікнёнае, кажучы па-беларуску, «людскае» Пасланне Аляксандр Лукашэнка ператварыў яшчэ і ў інструкцыю да дзеянняў. Што трэба зрабіць, каб агульны беларускі дом застаўся нашым. Каб нас, як тое часта было, не выштурхнулі з роднага гнязда і не ўпіхнулі ў хатынскі хлеў. Яшчэ раз паўтару — трэба зберагчы свой дом. Як той казаў, з гэтым заходнім наступленнем, у тым ліку эканамічнымі санкцыямі, — не да раскошы. Але... Эканоміка працуе. І прыбытак ад гандлю ёсць. Урад паспяхова дыверсіфікаваў рынкі. У перыяд эканамічнай блакады і пенсіі павялічваем, і цэны трымаем.

Дарэчы, цэны, як аказалася, залежаць ад унутранай палітыкі. Беларусь — сацыяльна арыентаваная дзяржава. Таму і цэны рэгулююць, і бясплатныя паліклінікі будуюць, і бацькоў немаўлят падтрымліваюць. Асабліва шматдзетных. Прамовы Лукашэнкі заўжды яскравыя і вострыя. Ён агучвае нават не мэйнстрымнае — патрэбнае: тое, што турбуе многіх. Вось і пра падтрымку шматдзетных сем'яў сказаў. Пра тых, хто свой дэмаграфічны ўклад ператварыў у бізнес. Калі мы хочам працягу роду і ўвогуле застацца ў гісторыі, трэба ж не дзеля выплат станавіцца бацькамі.

Прэзідэнт асабліва ўважліва аднёсся да захавання традыцыйнай беларускай духоўнасці. Дзяды замест Хэлаўіна, шматдзетнасць, увогуле КЛАСІЧНАЯ сям'я замест «чайлдфры». Беларусы асілілі імпартазамяшчэнне ў эканоміцы, цяпер час зрабіць тое ж самае і з духоўнасцю. Бо менавіта з ідэй чужынцаў, заморскіх «кодаў маралі», і пачынаюць навязваць новы ўклад жыцця. Цяпер гэта не толькі грамадска-палітычны лад. Гляньце на Украіну. Чаму вайна разгарнулася нават супраць святыняў? Бо англасаксам патрэбен толькі глабальны свет. Не мір. А свет. Усё астатняе знішчаюць. Шмат залатых думак было выказана Прэзідэнтам. І пра тое, што менавіта англасаксы — бенефіцыяры ўсіх «перамэн». Брудных і крывавых. Звычайныя еўрапейцы ў заложніках. І Беларусь — гэта Еўропа. Сапраўдная, у якой у кожнага ёсць свая дарога да храма. І не блытайце з мультыкультуралізмам. У нас беларуская верацярпімасць. Ніхто нікому не замінае адзначаць свой Вялікдзень альбо Пэйсах.

Шмат было пра геапалітыку. Бо мы на вастрыі. Гляньце на геаграфічную карту — беларускі балкон. І не мы сцягваем зброю на памежжа суседзяў. Яшчэ раз перaслухайце Прэзідэнта. Прамову пра бяспеку. І тэракты не мы намагаемся ўчыніць у суседзяў. Але варта рэагаваць, каб мір быў у нас. Мы хацелі б, каб не было вайны ў суседзяў. Ну не могуць беларусы сядзець за бяседай, калі ў суседа дзеці плачуць. Так і ў чалавечых зносінах, так і ў нашай палітыцы. Лукашэнка прапанаваў самы людскі варыянт. Каб спыніць бітву, трэба перастаць наносіць удары. Лібералы, ворагі і заходнікі крычалі: маўляў, не будзем мы слухаць Пасланне. Так не слухалі, што ўжо тыдзень разбіраюць, пішуць, тлумачаць. Па ўсіх паказчыках, праглядаў было больш, чым летась. Як у краіне, так і за яе межамі. Мільёны! Гістарычнай прамова стала для ўсіх. Слухалі. Пачулі. А ці ўцямілі?..

І галоўнае. Ці застанецца Прэзідэнт? Ну не па-лукашэнкаўску пакідаць хату, калі ў адных суседзяў — пажар, другія — са зброяй у руках спадылба паглядаюць у наш бок. Лукашэнка шмат зрабіў для краіны, для беларусаў. Цяпер намагаецца ўмацаваць і пакінуць такую сістэму, каб захаваць усё, што сёння маем. Звычайнае жаданне бацькі.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю намесніка Міністра эканомікі Рэспублікі Беларусь МІЦЯНСКАГА Сяргея Віталевіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

# БЛАКІТНАЕ ПАЛІВА Ў ЖЫЛЛІ




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Газавікі сведчаць, што работа па забеспячэнні людзей прыродным газам добра наладжана. У межах праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» ствараюцца падводзячыя да сельскіх населеных пунктаў газаправодаў. Унутры мястэчак жыллё, якое эксплуатуецца, аснашчаецца газам згодна з Указам № 368, а ў новым жыллі, што будуецца, — у межах рэалізацыі Указа № 72.

Згодна з законам аб мясцовым самакіраванні, газазабеспячэнне на пэўнай тэрыторыі арганізоўваюць мясцовыя выканкамы. Каб газіфікаваць сваё жыллё (існуючае або тое, што будуецца), любы чалавек можа звярнуцца ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган з адпаведнай заявай. Да яе трэба прыкласці дакумент, які пацвярджае правы ўласнасці на дом, дзе мяркуецца пралажыць газ і праз пэўны час гаспадар атрымае тэхнічныя ўмовы, падзяліўся спецыяліст:

— *Арганізаваць газіфікацыю домаўладання можна самастойна. Аднак паколькі газіфікацыя — складаны і шматэтапны працэс, лепш звярнуцца да газазабеспячальнай арганізацыі ў службу заказчыка. Чалавеку бязвыплатна вызначаць праектную і падрадную арганізацыі, аформяць неабходныя для ўводу ў эксплуатацыю збудаванага газаправода дакументы. Уласніку застанецца толькі заплаціць за работы па газіфікацыі.*

### Кошт — ад аб'ёму спажывання

Прыродны і звадкаваны газ, які газазабеспячальныя арганізацыі адпускаюць спажыўцам, уключаны ў пералік тавараў (работ, паслуг), кошт якіх рэгулюецца Саўмінам. Цэны на газ публікуюцца ў пастанове Саўміна № 1166, у якую штогод уносяцца змяненні. У канцы 2022-га ў гэты дакумент пастановай № 952 былі ўнесены змяненні, якія вызначылі цэны на газ для насельніцтва, што адпавядаюць гранічна дапушчальным цэнам, вызначаным Указам Прэзідэнта № 461, падзяліўся **Сяргей ХОЎРЫН, начальнік эканамічнага ўпраўлення Белпаліўгаза.**

— *При гэтым дзяржавай рэгулююцца як субсідзіруемыя цэны, так і тыя, што пакрываюць эканамічна абгрунтаваныя затраты на аказанне паслуг газазабеспячэння. З дакладнымі лічбамі па газе можна азнаёміцца ў цэнтрах абслугоўвання насельніцтва на інфармацыйных стэндах або на сайтах газазабеспячальных арганізацый.*

Адносна вызначэння сёлетніх цэн ніякіх змяненняў не было. Аднак летась з 1 чэрвеня істотна змяніліся цанавыя ўмовы для групы абанентаў, якія маюць устаноўленыя прылады індывідуальнага ўліку расходу газу пры наяўнасці газавых ацяпляльных прылад (катлоў) і лічыльнікаў. Была адменена сезонная дыферэн-




цыяцыя тарыфаў, прывязаная да летняга і ацяпляльнага перыядаў, і вызначана адзіная цана. Такі ж падыход застаўся і сёлета, дадаў эксперт:

— *Уладальнікі жылля, дзе ўстаноўлены прылады індывідуальнага ўліку расходу газу пры наяўнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прылад па субсідзіруемых цэнах будуць плаціць наступным чынам: з 1 студзеня да 31 мая ўключна — 19,93 капейкі за м³, з 1 чэрвеня да 31 снежня ўключна — па 20,62 капейкі за м³. Кошт газу, які забяспечвае поўнае пакрыццё эканамічна абгрунтаваных затрат, складае 57,5 капейкі за м³.*

Застаўся і парадак, які прадугледжвае аплату газу па тарыфах, што дыферэнцыруюцца ў залежнасці ад аб'ёмаў газаспажывання, якія вызначаюцца нарастаючым вынікам з пачатку года. Абаненты, якія спажылі да 3 000 м³, аплачваюць яго па субсідзіруемым кошце. Тыя, хто напаліў ад 3 000 да 5 500 м³, мусяць плаціць з павышальным каэфіцыентам 1,3. З 1 студзеня да 31 мая ўключна гэта 25,91 капейкі за м³, а з 1 чэрвеня да 31 снежня ўключна — 26,81 капейкі. Гаспадары, які выйшлі за межы 5500 м³, мусяць плаціць па эканамічна абгрунтаваных тарыфах (57,5 капейкі за м³).

Калі ў чалавека няма індывідуальных ацяпляльных газавых прылад, цана на газ для яго вызначана на год і складае 54,77 капейкі за м³.

Звадкаваны газ (у балонах па 50 літраў) па субсідзіруемых тарыфах абыдзецца беларусам у 22,05 рубля за балон — рубель і пяць капеек за літр газу. Балон такога ж памеру па эканамічна абгрунтаваных тарыфах пацягне на 55,4 рубля (2,64 рубля за літр).

### Калі жыллё — дача ў садовым таварыстве

Парадак разліку за паслугі газазабеспячэння для насельніцтва вызначаны палажэннем Саўміна № 571 аб парадку разлікаў і ўнясення платы за жыллёва-камунальныя паслугі і платы за карыстанне жылымі памяшканнямі дзяржаўнага жыллёвага фонду, удакладніў **Уладзімір ЗАВАЛЬНІКАЎ, начальнік упраўлення газазабеспячэння і маркетынгу Белпаліўгаза:**

— *Згодна з нарматыўнымі дакументамі, асобы, якія пражываюць у садовых доміках (дачах), аплачваюць паслугі газазабеспячэння па эканамічна абгрунтаваных тарыфах на аказанне гэтых паслуг. Аднак у 2018 годзе Мінэнерга ўнесла змяненні, якія дазволілі прымяняць да асобных катэгорый грамадзян дыферэнцыяваную сістэму аплаты. Гэта непрацаўладкаваныя пенсіянеры, асобы, якія маюць права на льготы, а таксама інваліды III групы.*

27 лютага 2023-га пастановай Саўміна № 155 канкрэтызаваны ўмовы, якія павінны вытрымлівацца абанентамі, што пражываюць у садовых таварыствах, каб яны маглі плаціць за газ па субсідзіруемых тарыфах. Цяпер на тое маюць права непрацуючыя пенсіянеры, асобы, якія маюць права на льготы, а таксама інваліды III групы. Пры гэтым яны павінны быць зарэгістраваны па месцы знаходжання (здымацца з рэгістрацыйнага ўліку па асноўным месцы жыхарства не трэба) і быць уладальнікамі памяшкання (садовага доміка або дачы).

### Тарыфы тэхабслугоўвання...

Кошт іншых работ, якія праводзяць газазабеспячальныя арганізацыі, у тым ліку тэхнічнае абслугоўванне, не трапляюць у пералік работ, што рэгулююцца Саўмінам. Тарыфы на такія работы сфарміраваны газазабеспячальнымі арганізацыямі з улікам кан'юнктуры рынку і абмежаваннямі, вызначанымі дзяржорганамі, якія рэгулююць заканадаўства цэнаўтварэння, звярнуў увагу Сяргей Хоўрын:

— *Дадатковыя расходы ў газіфікаваных прыватных дамах, звязаныя з неабходнасцю правядзення штогадовага тэхнічнага абслугоўвання ацяпляльных апаратаў і катлоў, воданагравальнікаў газавых праточных, на адну адзінку абсталявання складаюць да 30 рублёў без прамыўкі цеплаабменніка. Калі неабходная прамыўка, цана будзе ад 40 да 60 рублёў.*

Раз на дзесяць гадоў газавікі праводзяць таксама комплекснае тэхнічнае абслугоўванне ўводных, унутраных газаправодаў і газавага абсталявання, кошт якога складае ў сярэднім 40 рублёў.

Разлік тарыфаў на тэхабслугоўванне робіцца зыходзячы з планавых затрат на аказанне паслуг, выдаткаў і іншых плацежных абавязацельстваў, вызначаных законам, удакладніў спецыяліст:

— *Прэйскуранты можна паглядзець на інфармацыйных стэндах у газазабеспячальных арганізацыях або па тэлефоне. Канчатковы кошт вызначаецца падчас правядзення работ, зыходзячы з канкрэтнага і дакладнага аб'ёму (пераліку) выкананых работ і зацверджаных тарыфаў.*

Аплаціць паслугі газавікоў можна непасрэдна падчас выканання работ або потым, але не пазней за 25-е чысло месяца, які надыходзіць услед за разліковым.

### ...і тэрміны жыццяздольнасці

Каб карыстацца газам бяспечна, неабходна падтрымліваць у тэхнічна спраўным стане ўсё газазабеспячальнае абсталяванне. Тэрміны яго прафілактыкі вызначаны практыкай, удакладніў **Уладзімір РУСЬ, начальнік упраўлення сістэм газазабеспячэння Белпаліўгаза:**

— *Раней агляд газавых пліт рабіўся раз на тры гады, аднак узровень тэхнікі і тэхналогій ды, адпаведна, бяспечнасці павышаецца, таму цяпер комплекс тэхработ дастаткова праводзіць раз у дзесяцігоддзе. А тэхабслугоўванне воданагравальнага і ацяпляльнага абсталявання, якое цяпер праводзяць раз на год, раней рабілі двойчы на год: перад пачаткам і пасля завяршэння ацяпляльнага сезона. Уводныя і ўнутраныя газаправоды шматкватэрнага жылля, якія функцыянуюць больш як 20 гадоў, тэхнічна абслугоўваюцца штогод. Нават дагавор на газазабеспячэнне не падпісваецца, пакуль не будзе заключаны дагавор на тэхабслугоўванне.*

Усё абсталяванне пасля завяршэння вызначанага яго вытворцам тэрміну эксплуатацыі (але не больш як 20 гадоў) павінна прайсці дыягностыку, якая дазволіць або працягнуць тэрмін дзеяння, або запатрабуе замены.

Самы, бадай, просты спосаб кожнаму чалавеку самастойна забяспечыць бяспеку свайго жылля — пасля карыстання газам заўжды закручваць вентыль на газавым балоне і кран на газавай трубе пры цэнтралізаваным падключэнні газу.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Дональду Трампу пагражае да 136 гадоў турэмнага тэрміну



Абвінавачанні, прад'яўленыя былому прэзідэнту ЗША Дональду Трампу, прадугледжваюць максімальнае пакаранне ў выглядзе 136 гадоў турэмнага зняволення, паведамляе тэлеканал Fox News. «Хоць фактычны тэрмін, хутчэй за ўсё, будзе нашмат меншы, калі ён будзе прызнаны вінаватым па любым ці па ўсіх пунктах абвінавачання», — лічаць на тэлеканале. Раней экс-прэзідэнту ЗША прад'явілі абвінавачанні па 34 пунктах, якія датычацца фальсіфікацыі дзелавых дакументаў і злачынная змовы. Тэлеканал удакладняе, што фальсіфікацыя дзелавых дакументаў, як правіла, у Нью-Ёрку з'яўляецца абвінавачаннем у дробным правапарушэнні, але павышаецца да ўзроўню крымінальнага злачынства з максімальным тэрмінам зняволення ў чатыры гады, калі «намер абвінавачанага падмануць уключае намер учыніць іншае злачынства або дапамагчы схаваць яго ўчыненне». Трамп па прад'яўленых яму абвінавачаннях вінаватым сябе не прызнаў. Ён стаў першым у гісторыі ЗША былым кіраўніком дзяржавы, які падвергся крымінальнаму пераследу. Экс-прэзідэнт і яго саюзнікі неаднаразова заяўлялі, што абвінавачанні ў яго адрас палітычна матываваныя.

### Цэнтрабанкі ў лютым закупілі каля 52 тон золата



Сусветныя цэнтрабанкі ў лютым, паводле папярэдніх даных, закупілі 51,7 тоны золата ў золатавалютныя рэзервы, вынікае з інфармацыі World Gold Council (WGC). Гэта не ўлічвае дынаміку золатавалютных рэзерваў Расіі, якую ў сакавіку раскрыў Банк Расіі (плюс 31,1 тоны прыкладна за год). Найбуйнейшымі дзяржпакупнікамі золата ў лютым былі Кітай (24,9 тоны) і Турцыя (22,5 тоны). Таксама запасы павялічылі Узбекістан (8,1 тоны), Сінгапур (6,8 тоны) і Індыя (2,8 тоны). Найбуйнейшым прадаўцом аказаўся Казахстан (13,1 тоны). Запасы золата ў сусветных цэнтрабанках растуць адзінаццаць месяц запар. У студзені, паводле ўдакладненых звестак, яны дадалі 73,7 тоны.

### Сезон цвіцення сакуры можа прынесці эканоміцы Японіі $4,7 млрд



Сезон цвіцення сакуры ў Японіі сёлета, як чакаецца, прыцягне мноства турыстаў дзякуючы зняццю каранцінных абмежаванняў, што забяспечыць падтрымку мясцоваму бізнесу. Эксперты Kansai University мяркуюць, што пазітыўны эфект ад росту дзелавой актыўнасці ў дадзены перыяд для эканомікі Японіі можа дасягнуць 616 мільярдаў іен ($4,7 млрд). Як малы, так і буйны бізнес у Японіі (ад сеткі кавярняў Starbucks Corp., якая прапануе наведвальнікам тэматычныя напоі ў згаданы перыяд, да тураператараў і гасцінічных сетак) залежыць ад дакладнасці прагнозаў экспертаў адносна дат цвіцення сакуры, адзначае агенцтва Bloomberg. Улічваючы, што пік цвіцення доўжыцца прыкладна тыдзень, дакладнасць прагнозаў вельмі важная, паколькі бізнесу неабходна ўгадаць з маркетынгавымі акцыямі. У 2007 годзе Японскае метэаралагічнае агенцтва было вымушана прынесці публічныя выбачэнні ў сувязі з тым, што яго эксперты памыліліся з датамі на дзевяць дзён.

# ВАДА ВЯДЗЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мяне як карэспандэнта, што прыехаў на здымкі, ратавальнікі забяспечылі вадалазным касцюмам. Пераадольваю тэрыторыю падтопленай дарогі побач з лодкай, якую супрацоўнікі МНС вядуць на повадзе. На такім вымушаным водным «таксі» ратавальнікі дапамагаюць дабрацца да месца прызначэння рамонтніку-спецыялісту па ацяпляльных катлах. Мужчына тлумачыць, што яго тэрмінова выклікалі на адрас на падтопленай вуліцы.

— Мяне папярэдзілі, што вада, узяў з сабой гумавыя боты, але аказалася, што гумовікі да калена не дапамогуць, — з выратавальнай лодкі кажа мужчына.

Насустрач нам сваім ходам — у высачэзных рыбацкіх ботах — кіруе да «вялікай зямлі» жыхарка Палявой. За некалькі хвілін вулічнай аквааэробікі ў непрамакальнай амуніцыі па сабе зразумела, што прайсці па вуліцы ў вадзе даволі складана. Юлія (знаёмлюся з жыхаркай Палявой) ідзе ў ботах з сумкай наперавес, а ў руках хавае ад вады свой цывільны абутак. Пераабуўшыся, едзе ў горад па справах.

— У мяне двое дзяцей. Адзін вучыцца ў каледжы, другі — у школе. Той, што ў школе, зараз пакуль дома, бо цяжка дабірацца, а ў школе другая змена. Я яшчэ хаджу пакуль, не ведаю, прайду заўтра ці не. Будзем да ратавальнікаў звяртацца, каб прыязджалі, падвозілі, калі што, — тлумачыць жанчына.

## Свая водная руціна

На затопленай частцы вуліцы ўсе жылыя падворкі стаяць з расчыненымі брамкамі і варотамі. Многія пакінулі свае двары незачыненымі — пайшлі на работу, вучобу. І ўсё ж з некалькімі жыхарамі Палявой пагаварыць удаецца. З двара на лодцы выплывае юнак. Прадстаўляецца Славам, вучыцца ён у дзясятым класе.



— У нас у сям'і, акрамя мяне, яшчэ два браты-школьнікі. Я сёння не пайшоў — дапамагаў бацьку перавозіць усіх на лодцы, а заўтра давядзецца, — здаецца, крыху расчаравана з-за непазбежнасці школьных будняў кажа юны вясляр.

Вячаслаў расказаў, што вада прыйшла да іх у двор, але да самой хаты яшчэ не дабралася. Вароты і брамку з раніцы прыйшлося адчыняць насцеж, каб не выламала. Перасялілі на вышэйшае месца і Сняжынку: хлопец паказвае на вялікага сабаку-ахоўніка ў двары.

— Пакуль можна нават за вёслы не садзіцца, а проста каго трэба, як на буксіры, на лодцы цягнуць па вуліцы. А ўвогуле кіраваць лодкай — гэта элементарна. У мяне і бабуля ўмее веславаць, — адзначае школьнік.

Хлопец запрашае зайсці да іх у двор. Якраз дадому вярнуўся бацька.

— Вада так моцна заліла вуліцу за адны суткі. Учора можна было спакойна хадзіць. У нас увогуле з двух бакоў вада — і на агародзе, і перад домам. Думаю, тыдні два будзем чакаць, пакуль сыдзе, — прагназуе Аляксандр Глеўскі.



Пытаюся, ці ёсць праблемы з дастаўкай прадуктаў, вадой.

— Праблем ніякіх няма. У цэнтры горада жывём, лічы. Мы прывычныя: падстрахаваліся загадзя, закупілі прадукты. У нас жа з жонкай васьмёра дзяцей. Чацвёра маленькіх — пагодкі. Калі раптам урача выклікаць трэба будзе дадому, ратавальнікі дапамогуць. Мы не хвалюемся і з'язджаць не плануем.

Суседзі гэтай вялікай сям'і — бацькі Аляксандра. Гаспадар падворка Сяргей Станіслававіч жыве на Палявой амаль 65 гадоў. І ні разу, кажа, вада не спалохала, не выгнала з дому.

— Быў хлопцам, памятаю, вада па вокны стаяла ў нас. Дык мы з бацькамі, бабуляй перасяліліся, але недалёка — на гарышча, — смяецца Сяргей Станіслававіч. — Так і жылі, яшчэ і печ умудраліся паліць у затопленым доме.

— Цяпер прыпасаў нарыхтавалі, са склепа бульбачку ўсю перанеслі. Рыхтаваліся да вялікай вады з зімы, бо ў адлігу ў студзені паднялася рака і затапіла ўвесь наш агарод, — дадаюць жонка гаспадара дома Таццяна Барысаўна і дачка Вольга. — Мы не баімся заставацца дома. Нас папярэдзілі: калі што — набіраць ратавальнікаў.

## Не толькі перавозка

Пакуль вяртаюся водным шляхам да сухога ўчастка дарогі, дзяжурныя ратавальнікі ўжо прынялі ад адной сямейнай пары з Палявой заяўку на эвакуацыю. Людзі растлумачылі: вада яшчэ не падышла да жылля, але ў іх маленькае дзіця, пакуль ёсць магчымасць спакойна сабраць рэчы і перасяліцца, чакаць «з ракі надвор'я» не хочуць. Такія просьбы аб эвакуацыі ратавальнікі аператыўна перадаюць у адміністрацыю раёна Гомеля.

### У тэму

Паводле апошняй аператыўнай інфармацыі на ўчарашні дзень, талымі і паводкавымі водамі на Гомельшчыне падтоплена 68 жылых дамоў, 17 падвалаў жылых дамоў, 478 падворкаў, 181 гаспадарчая пабудова, 153 іншыя будынкі (нежылых і дачных дамоў), а таксама 35 участкаў дарог.

— Падраздзяленні МНС гатовыя да любога развіцця падзей і змянення аператыўнай паводкавай абстаноўкі, — падкрэсліў **афіцыйны прадстаўнік Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Ягор ПАСКАННЫ.** — Супрацоўнікі абследуюць падворкі на факт падтоплівання і неабходнасці аказання дапамогі насельніцтву. Для аказання дапамогі ў перамяшчэнні па падтопленай частцы вуліцы арганізавана дзяжурства супрацоўнікаў з сямі раніцы да дзевяці вечара.

Таксама ратавальнікі на згаданым участку горада перыядычна маніторацъ паводкавую сітуацыю з дапамогай квадракоптара — з вышыні аналізуецца маштаб падтоплівання, дынаміка змянення сітуацыі.



— Калі паступіла паведамленне аб пагрозе паводкі і эвакуацыі, неадкладна выходзьце з небяспечнай зоны ў прызначаны бяспечны раён або на ўзвышаныя ўчасткі дарогі. Перад выхадам з дому абавязкова выключыце электрычнасць, газ, замацуйце ўсе плывучыя прадметы. Вазьміце з сабой дакументы, каштоўныя і неабходныя рэчы і двухсутачны запас прадуктаў. Калі жыллё падтопліваецца да прыбыцця дапамогі, перабірайцеся на верхнія паверхі, дах будынка і падавайце сігнал бедства. Пры падыходзе ратавальнікаў без панікі пераходзьце ў плыўсродак і няўхільна выконвайце патрабаванні ратавальнікаў, — засяродзіў увагу на асноўных правілах паводзін падчас паводкі афіцыйны прадстаўнік Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС.



Аператыўна рэагуюць на развіццё паводкавай сітуацыі ў Гомелі і спецыялісты Гомельскай абласной арганізацыі Таварыства выратавання на водах. З боку затопленых цэнтральнага пляжа і дарогі, што якраз вядзе да тэрыторыі Якубоўкі, супрацоўнікі Таварыства выратавання на водах правялі маніторынг сітуацыі. Пляжная інфраструктура, якая амаль цалкам пайшла пад ваду, звяртаюць увагу спецыялісты, можа быць небяспечная для плавальных сродкаў насельніцтва.

— Ва ўмовах вялікай вады мы настойліва рэкамендуем людзям адмовіцца ад самастойнага перамяшчэння па падтопленай тэрыторыі і ні ў якім разе не рабіць тое пасля ўжывання алкагольных напояў. У рэгіёне з пачатку года тры чалавекі патанулі менавіта на разліве рэк. Загінулыя знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення, — адзначыў **спецыяліст Гомельскай абласной арганізацыі Таварыства выратавання на водах Мікіта ЛІСОЎСКІ.** — Паводкавую сітуацыю неабходна абавязкова ўлічваць пры планаванні адпачынку на прыродзе. Напрыклад, летась у Мазырскім раёне чатыры дзяўчыны пайшлі на пікнік на бераг ракі. Яны заблудзіліся на пойме, а з-за таго што талыя воды вельмі хутка падымаліся, апынуліся ў небяспечным становішчы. Дзяўчат эвакуіравалі, на шчасце, ніхто з іх не пацярпеў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

### Дарэчы

## Бярэзіна, Проня і Друць дадаюць па 11 сантыметраў

Ападкі ў выглядзе снегу і дажджу, якія апошнім часам ідуць ледзь не кожны дзень, прымушаюць не расслабляцца. Паводле інфармацыі Магілёўаблгідрамета, тры ракі ў вобласці працягваюць паявілвацца ў памерах. Растуць Бярэзіна ў раёне Бабруйска, Друць каля вёскі Гарадзішча Магілёўскага раёна і Проня паблізу вёскі Ліцягі на Слаўгарадчыне. А гэта значыць, ёсць пагроза падтоплівання грамадзянскай інфраструктуры, а дзесьці, не выключана, і жылога сектара.

— Сёлетнія паводкавыя працэсы даволі актыўныя, такое назіралася апошнім разам дзесяць гадоў таму, — удакладняе **кіраўнік групы гідралогіі Магілёўаблгідрамета Іна ФІЛЁВА.** — Дняпро каля Магілёва, напрыклад, падняўся больш як на 4,7 метра. Гэта сур'ёзная адзнака. Але сітуацыю змякчае тое, што вада ў ім ужо пакрысе пачынае падаць. Што не скажаш пра Бярэзіну, Проню і Друць. Яны дадаюць па 11 сантыметраў у суткі. Дарэчы, сёлета ўзровень вады ў Сожы перавысіў сярэднія шматгадовыя значэнні, а Дняпро быў вельмі блізкі да гэтага.

На 4 красавіка ў Магілёўскай вобласці было падтоплена 56 падворкаў, 24 гаспадарчыя пабудовы ў садаводчым таварыстве «Хімік-2» Магілёўскага раёна, паведаміла **афіцыйны прадстаўнік Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС Інеса ЯЛФІМАВА.**

Пад вадой апынуліся пяць нізкаводных аўтамабільных мастоў і пяць участкаў прылеглых да іх дарог у Мсціслаўскім, Слаўгарадскім, Чавускім і Хоцімскім раёнах.

— На шчасце, эвакуацыя пакуль нікому не спатрэбілася. Сітуацыя пад кантролем, — запэўнівае спецыяліст.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Сямейная газета

Выпуск № 6 (209)

# Святое Уваскрэсенне Хрыстова

## Святар — пра значэнне Вялікадня ў жыцці кожнага чалавека і пра тое, як яго святкаваць

**Уваскрэсенне Хрыстова сімвалізуе для хрысціян усяго свету перамогу жыцця над смерцю. Галоўнае свята ў хрысціянскім календары, Вялікдзень, — сімвал неверагоднай сілы, якую маюць любоў і вера.**

**Напярэдадні Уваскрэсення Хрыстовага па традыцыі мы гутарым са святаром, настаяцелем прыхода храма Свяціцеля Спірыдона Трыміфунцкага ў Мінску Аляксандрам ПАЛЬЧЭЎСКІМ пра тое, як сустрэць і правесці гэтае свята, і пра яго глыбокі сэнс.**



### Смерцю смерць адолеўшы

Дзень Светлага Хрыстовага Уваскрэсення для хрысціян — час асаблівых урачыстасцяў і духоўнай радасці, калі вернікі збіраюцца ў храмах славіць уваскрэслага Хрыста, а ўвесь велікодны тыдзень святкуецца «як адзіны дзень» (царкоўная служба ўвесь тыдзень амаль цалкам паўтарае начное велікоднае богаслужэнне).

Вялікдзень — гэта ўрачысты ўспамін аб Уваскрэсенні Ісуса Хрыста на трэці дзень пасля Яго пакут і смерці. Знятые з крыжа і пахаванне Госпада было здзейснена ў вечар пятніцы. Жанчыны, якія суправаджалі Госпада і вучняў з Галілеі, прыйшлі да магілы Гасподняй на досвітку таго дня, які мы цяпер называем нядзельным. Але труну яны знайшлі пустой, а анёл абвясціў ім, што Хрыстос уваскрос. У гэты дзень крыху больш за дзве тысячы гадоў таму адбылася падзея сусветнага маштабу, якая закранула ўсіх людзей: і тых, хто жыве, і памерлых, таму свята Вялікадня датычыцца кожнага, кажа Аляксандр Пальчэўскі.

— Прыняўшы на сябе чалавечую плоць, якая была пашкоджана грахом, Хрыстос аднавіў і ацаліў яе ў Сабе, узвёў на тую духоўную вышыню, якую чалавек страціў з грэхападзеннем Адама. На 40-ы дзень пасля Вялікадня ён узнёс яе на неба, і такім чынам ажыццявілася аднаўленне пашкоджанай чалавечай прыроды. Гэтую абноўленую прыроду людзі цяпер наследуюць праз Хрыста.

Дзякуючы Вучэнню, Смерці і Уваскрэсенню Ісуса для чалавека стала магчымым больш поўнае пазнанне Бога, зносіны з ім і ўступленне ў духоўнае адзінства праз таінствы Царквы. Для веруючага хрысціяніна Вялікдзень — гэта глыбокае духоўнае перажыванне.

— Хачу акцэнтаваць увагу на «практычным вымярэнні» гэтага свята — не толькі для чалавецтва ў цэлым, але ў першую чаргу для кожнага чалавека паасобку, — кажа святар. — Уваскрэсенне Ісуса Хрыста з'яўляецца падставай і пацвярджэннем таго, што кожнага з нас таксама чакае ўваскрэсенне. У вучэнні нашай Царквы ёсць сцвярджэнне, што ўсеагульнае ўваскрэсенне людзей будзе падобна на тое, як Ісус Хрыстос уваскрос у сваім целе на трэці дзень пасля смерці. Гэта сцвярджэнне з'яўляецца асновай хрысціянства. У цэнтры хрысціянскага вучэння знаходзіцца не нейкая сума маральных і сацыяльных праграм і правілаў, а сцвярджэнне, што жыццё душы чалавека вечнае і пасля фізічнай смерці адбудзецца ўваскрэсенне кожнага. Калі зразумець гэта, набывае асэнсаванасць усё тое, што ў нашым жыцці здараецца: нічога ў ім не здзяйсняецца дарэмна і не праходзіць бясследна. Нашы ўчынкі і думкі, пачуцці і рашэнні фарміруюць наша ўнутранае ўладкаванне, з якім мы пяройдзем у вечнае жыццё. І стан чалавека ў гэтым вечным жыцці будзе залежаць ад таго ўнутранага патэнцыялу, які ён у сабе раскрыў ці не раскрыў. Грэшніку прыйдзецца вечна пакутаваць ад нерэалізаванай любові да Бога і людзей і несці цяжар тых грахоў, у якіх ён жыў. А для чалавека, які імкнуўся жыць праведна, вечнае жыццё будзе поўнае радасці і асалоды. Апосталы казалі: калі Хрыстос не ўваскрос, наша пропаведзь марная. Але Яго Ўваскрэсенне дае надзею на вечнае жыццё і нам.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

Тыя, хто побач

# «Жывём нясумна, усё робім разам»

## Шматдзетная сям'я перабралася з горада ў вёску, завяла вялікую гаспадарку і адраджае бабулін дом

**Целяцiцкія цяпер звычайная вясковая шматдзетная сям'я. Ну, можа, хіба трошачкі не зусім звычайная. Да нядаўняга часу Святлана і Аляксандр былі пінчанамі, жылі і працавалі ў сталіцы Палесся, выхоўвалі траіх дзяцей. Але, атрымаўшы ў Пінску трохпакаёвую кватэру на льготных умовах, прынялі рашэнне... перабрацца ў вёску. У Колански Івацэвіцкага раёна Святлану шмат гадоў чакаў дом яе любімай бабулі Тоні.**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*



У гасцях у «СГ»

## Павел ГУШЫНЕЦ:

# «Не існуе толькі чорнага і белага»

**«Не нашкодзь» — галоўны прынцып медыцыны, але наш герой, думаю, кіруецца ім па жыцці. Павел Гушынец па адукацыі ўрач, але многім вядомы яшчэ і як аўтар шматлікіх кніг, якія, у прыватнасці, убачылі свет і ў Выдавецкім доме «Звязда». Стварыць дзіцячыя творы, напрыклад, яго некалі натхніла дачка, для якой тата прыдумваў гісторыі перад сном. А вось пра тое, калі захапленне Паўла Уладзіміравіча перарасло ў рамяство на доўгія гады, дзе ён мае магчымасць пражываць дзяцінства па-новаму і якіх поглядаў прытрымліваецца ў выхаванні дзяцей, мы распыталі ў яго падчас сустрэчы.**

***— Ведаю, што напісанне кніг — своеасаблівае захапленне ў вашым жыцці. Калі яно з'явілася?***

— Першыя свае нататкі я напісаў у 13 гадоў. Улічваючы, што я шмат чытаў (тады яшчэ не было камп'ютараў, прыставак і тэлефонаў), то перыядычна мне не падабалася, чым заканчваецца кніжка. І я ў сілу фантазіі нешта дадумваў. Але ідэя пачаць пісаць самому не прыходзіла. І вось у класе сёмым мой сябар Паша Сікорскі, з якім мы сядзелі разам за апошняй партай, адночы расказаў, што піша апавяданне. Тады і я задумаўся: а чаму сам не магу напісаць штосьці? Той момант, бадай, і стаў штуршком...

Ідэй розных было безліч. Пачынаў з навуковай фантастыкі, потым фэнтэзі, а па меры назапашвання вопыту запісваў жыццёвыя гісторыі. Калі вучыўся ў медыцынскім вучылішчы, гэта быў 1997 год, пайшоў працаваць у Полацкую раённую бальніцу. Цяпер яе ўжо няма, там будуюць кадэцкі корпус. А тады гэта было сакральнае месца: пабудова 1800-х гадоў, дзе дзейнічаў Полацкі кадэцкі корпус, у якім вучыўся адзін з роду Раманавых... Пры гэтым я працаваў у прыёмным пакоі бальніцы, куды ў цяжкія 90-я хто толькі і з чым не трапляў. Мне, 17-гадоваму хлопцу, было вельмі цікава за ўсім назіраць. І з сабой я заўсёды насіў блакноцік. У яго запісваў



Сустрэча з чытачамі.

гісторыі, якімі са мной дзяліліся пацыенты. Менавіта тыя размовы пасля ляглі ў аснову медыцынскай серыі кніг — зараз ужо сёмую да выхаду рыхтую.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

# Святое Уваскрэсенне Хрыстова

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Сваёй смерцю Ісус перамог і знішчыў вечную смерць. Вялікдзень — сімвал адкрыцця для чалавека Царства Нябеснага і магчымасці для кожнага выратавання і поўнага яднання з Богам. Вялікдзень — радаснае, светлае свята. І перш за ўсё мы радуемся адчуванню прысутнасці Бога ў нашым жыцці і ў нашай душы.

## Традыцыі як вынік веры

Сімвалы Вялікадня — куліч і фарбаваныя яйкі — асвячаюцца ў царкве. Хрыстос сам пераломваў хлеб і разліваў віно падчас Тайнай вячэры за тры дні да свайго Уваскрэсення. Велікодны хлеб стаў сімвалам цела Хрыста. Што да фарбавання яек, традыцыя абвяшчае, што, калі Марыя Магдаліна распавяла рымскаму правіцелю Тыберыю пра Уваскрэсенне Хрыста, той адказаў: «Мёртвыя не ўваскрасаюць, як і яйкі не становяцца чырвонымі». І ў той жа момант яйкі на яго стале сталі ярка-чырвонымі. Імператар не адмаўляў відавочнага і вымавіў: «Сапраўды ўваскрос!» Велікодныя яйкі сімвалізуюць вечнае жыццё.

— Традыцыі нашай Царквы вельмі важныя, але ў першую чаргу важна разумець іх сэнс і змест, — тлумачыць святар. — Ёсць такое паняцце: «паданне Царквы». Мы маем тэксты Святога Пісання — кнігі «Старога Запавету» і «Новага Запавету». А таксама ёсць жывая традыцыя, сувязь вопыту хрысціян на працягу ўсёй гісторыі Царквы, з першых стагоддзяў хрысціянства да нашага часу. І царкоўныя традыцыі — выяўленне гэтай сувязі. Але калі мы не разумеем сутнасці абрадаў і традыцый, яны губляюць для нас сваю сілу, таму што набор нейкіх дзеянняў другасны ў адносінах да таго глыбокага сэнсу, які яны ў сабе нясуць. Гэтыя традыцыі не самадастатковыя — яны павінны быць вынікам светапогляду чалавека, яго веры. Няправільна, калі дачыненне да жыцця Царквы ў чалавека выяўляецца толькі ў выкананні велікодных або, скажам, калядных абрадаў. Бо тады ўбаку застаецца самае галоўнае — Бог. Богу не патрэбныя куліч і фарбаваныя яйкі — Яму трэба наша сэрца, наша любоў, наша імкненне быць хрысціянамі. У цэнтры свята павінен быць Гасподзь і ўсё тое, што Ён зрабіў дзеля нашага выратавання. Падкрэслю: царкоўныя традыцыі неверагодна важныя. Але без разумення сутнасці свята яны не прынясуць сапраўднай радасці. Правільны падыход — імкненне наблізіцца да Бога, пры гэтым не адмаўляючы асвячоныя часам абрады, якія ў гэтым дапамагаюць.

Пра тое святары гавораць на працягу многіх гадоў, і сёння, сцвярджае суразмоўца, грамадства пачынае іх разумець.





## Хрыстос уваскрос!

Такім чынам, святкаванне Вялікадня — гэта вялікая духоўная праца. І знешнія атрыбуты свята — толькі яе нязначная частка. Галоўнае выяўленне ўрачыстасці — удзел у святочным богаслужэнні.

— Святкаваць Вялікдзень, як і любое царкоўнае свята, азначае яго перажываць. Бо кожнае свята звязана з якой-небудзь важнай вяхой у жыцці Царквы. І Уваскрэсенне Хрыста — не проста падзея, якая адбылася дзве тысячы гадоў таму. Яна наўпрост звязана з кожным з тых, хто жыве цяпер, бо закранула сутнасць прыроды чалавека. Такім чынам, Вялікдзень — гэта наша ўнутранае, асабістае перажыванне той падзеі. І пачынаем акунацца ў гэтае свята мы яшчэ ў пачатку Вялікага посту: за гэтыя два месяцы хрысціянін праходзіць шлях, які дапамагае духоўна перажываць звязаныя з Вялікаднем падзеі.

Велікодная служба пачынаецца ўвечары суботы і працягваецца ўсю нядзельную ноч. Апоўначы раздаецца благавест, і адначасова з яго ўрачыстымі гукамі запальваюцца ўсе свечкі ў храме. Святары ў светлых уборах, з крыжам, свяцільнямі і фіміямам выходзяць з алтара і здзяйсняюць хрэсны ход. У канцы святочнай літургіі асвячаецца артас — хлеб з выявай крыжа і цярновага вянка.

— Таінства прычасця — важны складнік святкавання Вялікадня, — кажа Аляксандр Пальчэўскі. — Прычасце — гэта магчымасць духоўна злучыцца з Богам і вастрэй перажыць гэтую падзею ў сваёй душы. Без удзелу ў таінстве прычасця мы можам застацца назіральнікамі, якія не прымаюць удзелу ў тым, што адбываецца ў храме.

Вялікдзень у свядомасці нашых сучаснікаў — сямейнае свята. І гэта выдатна, калі ў такія святы блізкія сустракаюцца за святочным сталом. Але дамашняе святкаванне павінна быць працягам таго, што пачынаецца ў царкве, кажа святар.

— Сёння я часта назіраю, як на велікоднае богаслужэнне людзі прыходзяць цэлымі сем'ямі. Нярэдка для дзяцей гэта першы вопыт наведвання храма. Велікоднае богаслужэнне — выдатная магчымасць для дзіцяці пагутарыць са святаром і задаць хвалюючыя пытанні.

Святкаванне Вялікадня працягваецца 40 дзён — да Узнясення Хрыста. Усе гэтыя дні вернікі вітаюць адзін аднаго словамі: «Хрыстос уваскрос!» — «Сапраўды ўваскрос!»

## «Радасць усяму свету»

Згодна з царкоўным канонам, Уваскрэсенне Хрыстова святкуюць вясной, у першую нядзелю пасля поўні, якая надыходзіць услед за вясновым раўнадзенствам.

— Кожны год — і гэта дзіўна — Вялікдзень дорыць новыя, глыбокія, сапраўдныя і шчырыя перажыванні, якія не трэба ў сабе штучна ствараць. Гэты свет і духоўная радасць кожны раз наведваюць сэрца веруючага чалавека, — кажа настаяцель прыхода храма Свяціцеля Спірыдона Трыміфунцкага.

Прыняўшы на сябе чалавечую прыроду, Хрыстос адкрыў для людзей ісціну, што Бог — гэта Асоба, з якой любы чалавек можа ўступіць у глыбокі духоўны кантакт. Таму велікодны час вернікі важна ўспрымаць як падставу наблізіцца да ідэалу хрысціяніна.

— Які ён, гэты ідэал? Пра гэта кажа ўсё Евангелле. Калі коратка, усё зводзіцца да двух запаведзяў: любоў да Бога і любоў да бліжняга. На падставе гэтых двух прынцыпаў хрысціянін заклікаяны выбудоўваць усё сваё жыццё, — тлумачыць святар. — Важна, каб усё, што ён здзяйсняе перш за ўсё ўнутры сваёй душы і па-за ёю, было накіравана на гэтую любоў — да Бога і да бліжняга. Іншымі словамі, быць хрысціянінам — значыць старацца жыць не толькі для сябе, але і для іншых людзей. Будаваць сваё жыццё паводле тых прынцыпаў, якія прапаведуе Ісус Хрыстос. Змагацца са сваімі страсцямі і слабасцямі. Шлях змены чалавека складаецца, з аднаго боку, з намаганняў яго волі, накіраваных у бок дабра. З другога — у гэтым імкненні нас заўсёды падтрымлівае Гасподзь. У такім супрацоўніцтве чалавека з Богам і адбываецца яго духоўнае ператварэнне.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Добрая справа

# «Я МАРУ БЕГАЦЬ І СКАКАЦЬ!»

## Дапамагчы сямігадоваму Макару можа кожны ахвотны

**Мама і тата Макара Пінчука чакалі з'яўлення дзяцей цэлых 16 гадоў. І вось здарыўся цуд — у пары нарадзіліся трайняты — два хлопчыкі і дзяўчынка. І ўсё было цудоўна, пакуль... У 2019 годзе аднаму з дзетак, трохгадоваму Макару, паставілі страшны дыягназ — мышачная дыстрафія Дзюшэна-Бекера. Цяпер хлопчыку сем гадоў. І хвароба прагрэсіруе. Каб Макар працягваў хадзіць, яму тэрмінова патрэбны прэпарат «Аталурэн».**




Мышачная дыстрафія Дзюшэна-Бекера — гэта рэдкае генетычнае захворванне. Яно паступова адбірае ў Макара здольнасць хадзіць. «З выгляду Макарушка — звычайнае дзіця, — кажа яго мама Наталля, — але яму ўжо цяжка падымацца па прыступках, ён часта падае. З-за свайго дыягназу ён не можа бегаць і скакаць, як брат і сястра. Хлопчыку можа дапамагчы толькі прэпарат, які запавольвае развіццё гэтай хваробы».

10—13 працэнтам людзей у свеце з такім жа дыягназам дапамагае прэпарат «Трансларна» («Аталурэн»), і Макару, калі так можна сказаць, пашчасціла, ён трапіў у іх лік. Лекі дазволяць хлопчыку надоўга адтэрмінаваць інваліднае крэсла і жыць, як усе аднагодкі. Калі ж не пачаць прымаць іх своечасова, то ў сярэднім ва ўзросце 8—10 гадоў адбываецца страта здольнасці самастойна перасоўвацца, а пасля з'яўляецца сардэчная і дыхальная недастатковасці. Менавіта гэта можа адбыцца з Макарам... Але бацькі хлопчыка вераць у цуд!

Кошт прэпарата — 229772,40 еўра. Для сям'і гэта сума непад'ёмная. Бацькі Макара спадзяюцца, што на свеце шмат неабыякавых людзей, і просяць пасільнай дапамогі.

Падрабязную інфармацыю і пацвярджальныя дакументы можна знайсці ў Instagram-акаўнце Макара Пінчука @makar_pinchuk, які вядзе яго мама Наталля.

Давайце дапаможам Макару!



**Рэквізіты для дапамогі**

**Самы просты спосаб дапамагчы — папоўніць баланс МТС +375 (29) 715-45-91**

**Карта Беларусбанка 4255 1901 3363 6855 да 02/26**

**Імя карыстальніка: NATALIYA PINCHUK**

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

# «Жывём нясумна...»

## НЕ ПРАДАЕЦЦА ХАТА БАЦЬКОЎ

Сюды і перабраліся прыкладна пяць гадоў таму, тут нарадзіліся малодшыя Ягор і Саша. І цяпер у іх не толькі вялікая сям'я, але і вялікая гаспадарка. Дом таксама будзе вялікі, калі яго канчаткова дабудуюць. Паводле новай планіроўкі, закладзена шэсць пакояў, крыху пабольшае кухня, паменшаюць падсобныя памяшканні. Аляксандр — будаўнік па прафесіі, асноўнае робіць сваімі рукамі. Ужо многае адрамантавана і даведзена да ладу, напрыклад падлогі атрымалі новую сцяжку і пакрыццё. Але і наперадзе шмат работы.

Ацяпленне ў хаце пакуль пячное. Дзед некалі пабудаваў грунтоўна. Печкі даюць цяпла дастаткова. З перапланіроўкай давядзецца дабавіць адну печку альбо цалкам перайсці на іншае ацяпленне — пакуль яшчэ не вырашылі. Паступова вядзецца рамонт у пакоях з прыцэлам на тое, каб было зручна дзецям. Нават бабулін куфар стаіць і чакае свайго аднаўлення. Вырашылі, што ён стане хатнім музейным экспанатам, але застанецца карыснай рэччу адначасова, будзе выконваць функцыю вялікай камоды.

Гэтай вясной задача нумар адзін для гаспадара — будаўніцтва дзіцячай пляцоўкі для малых, з пясочніцай, з горкамі, з гушкалкай.

— Як гэта вы рашыліся — абое ж нарадзіліся і выраслі ў горадзе — памяняць шляхетны, старажытны Пінск на вёску? — задаю рытарычнае пытанне, ледзь пераступіўшы парог.

— «Не прадаецца хата бацькоў» — чулі пра такое? — весела падхоплівае гаспадар. — Вось і мая палавіна чым больш сталее, тым часцей сваю бабулю ўспамінае і раўняецца на яе. Тая была ўдарніца працы ў шырокім сэнсе, і гэта не хоча адставаць.

**«Яшчэ малая, я гаварыла: буду як ты, бабуля, і ў мяне, як у цябе, будзе чацвёра дзяцей. Я трошкі нават пераўзышла яе — у мяне пяцёра і гаспадарка большая».**

## ХАЧУ БЫЦЬ, ЯК БАБУЛЯ

Аказалася, папярэдняя гаспадыня хаты, Антаніна Якаўлеўна Сабко, была не проста калгасніцай, а сапраўды знакамітым чалавекам. За ўдарную працу яе, 24-гадовага брыгадзіра паляводчай брыгады, вылучылі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР. Пасля выбараў калгасніца з Коланска на сесіі ў Маскву ездзіла, у Крамлі пабывала. Да нядаўняга часу ў сям'і здымкі, дакументы захоўваліся. Некалькі гадоў таму сын Антаніны Віктар, Святланін бацька, прыняў рашэнне аддаць і дакументы, і ўзнагароды ў музей.

Святлана Целяціцкая пераканана, што як бабуля магла б зрабіць кар'еру, пайсці далёка, як ёй прарочылі многія, але яна выбрала сям'ю. Калі жанчына ездзіла ў Маскву, у яе быў толькі першынец. І тое цяжка даводзілася маладой матулі пакідаць дзіця на сваякоў. Відаць, і муж не падтрымліваў кар'ерныя амбіцыі жонкі. Таму яна

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*



Матуліна ўзнагарода.

да грамадскай работы астыла, нарадзіла яшчэ траіх дзяцей і да пенсіі працавала ў калгасе. Ну і, вядома, сваю заўсёды вялікую гаспадарку глядзела, спачатку дзяцей, потым унукаў гадавала. Адкуль жа ў Святланы гэтая любоў да хатняй жыўнасці, што цяпер гадуецца ў яе хлявах? Кожнае лета школьніцай праводзіла ў бабулі, навучылася ўпраўляцца і з каровай, і са свіннёй, і з птаствам.

**«Галоўнае — правільна арганізаваць свой час, а там усё само па сабе ў парадак выстраіцца. Работу ж не дзелім — хто свабодны, той і робіць неабходнае па гаспадарцы».**

«Яшчэ малая, я гаварыла: буду як ты, бабуля, і ў мяне, як у цябе, будзе чацвёра дзяцей. Я трошкі нават пераўзышла яе — у мяне пяцёра і гаспадарка большая», — весела каментуе Святлана.

## ШТО НА ПАДВОРКУ...

Цяпер у іх дзве каровы, бычок гадуецца, свінкі рохкаюць, ёсць таксама. Лішкі малака Целяціцкія здаюць на прыёмны пункт, мясам дзеляцца са сваякамі — гарадскім бацькам, братам, сёстрам гаспадароў па кавалку экалагічна чыстага мяса рэгулярна перападае.

Першапрычына вялікай гаспадаркі, несумненна, у тым, што Святлана жыўнасць любіць. Здавалася б, дзяцей столькі, адной работы па дому з мыццём, прасаваннем, гатаваннем процьма, а яна паспявае яшчэ дагледзець і накарміць столькі «галоў»! Вядома, робяць гэта разам з мужам, але ж... Ён часта заняты на розных будаўнічых аб'ектах, падпрацоўвае такім чынам, а вечарам на асноўнай рабоце — вартаўніком. І кожны раз ініцыятарам любога прыбаўлення ў статку становіцца яна.

— Было двое свінак, але падумала аднойчы, што трэба купіць яшчэ двое малых, — расказвае Святлана. — Прыкінула і... купіла! Першыя два тыдні мужу не казала, каб не нерваваць. Пакармлю хуценька, яны ляжаць, маўчаць. А ён вялікім паесці занясе, вылье ў карыта і нават не заўважае, што ў суседнім катушку таксама ёсць насельнікі.

— Яна, каб даў волю, слана купіла б і паставіла тут, — смяецца Аляксандр. — Часам даводзіцца стрымліваць жончын энтузіязм. Неяк надумалася: давай, маўляў, коніка купім. Я кажу, што больш рацыянальна мець трактар у гаспадарцы. Каня трэба карміць кожны дзень круглы год, а трактар стаіць і есці не просіць, толькі запраўляць мусіш, калі на работу выязджаеш.

— Але ж конь такі прыгожы, жывы, — не спыняецца гаспадыня. — Ну мы яшчэ паглядзім. Пасвіць ёсць дзе. Дарэчы, для нашай падсобнай гаспадаркі выдзелілі тры гектары пашы. Гэта вельмі істотная дапамога.



таксама пару авечак ды козачак, хрумстаюць караняплоды ў клетках трусы. А на птушыным двары гогалем ходзіць чубаты певень з вывадкам, а таксама качкі, гусі. Цяпер гаспадыня ўжо заклала першую партыю яек у інкубатар, хутка кураняты будуць. Наогул яна непапраўны эксперыментатар, аднойчы нават перапёлак вывела ў сваім інкубатары. Са звычайных, дарэчы, яек, тых, што прадаюцца ў краме. Але аказалася, што птушаняты вельмі патрабавальныя ў доглядзе, ім трэба ўвесь час аптымальную тэмпературу падтрымліваць, таму эксперымент не вельмі ўдаўся.

Словам, сямейная харчовая праграма выконваецца на ўсе сто. Малочныя прадукты свае, мясныя

## ...І Ў ХАЦЕ

Наогул, працаздольнасць маці вялікага сямейства здзіўляе. Акрамя таго, што дома работы процьма, яна яшчэ паспявае ў сезон падпрацоўваць у фермера па суседстве. «Як вы так дзень плануеце, хіба не спіце зусім?» — не хаваю свайго здзіўлення.

— Не, — адказваюць, — днём спраўляемся. Зімой нават пазней за шэсць раніцы ўстаём. А вось улетку давядзецца ў шэсць, а то і ў пяць падымацца. Да ўсіх клопатаў дабавіцца агарод. Галоўнае — правільна арганізаваць свой час, а там усё само па сабе ў парадак выстраіцца. Работу ж не дзелім — хто свабодны, той і робіць неабходнае па гаспадарцы.

Паводле маіх падлікаў, на такое сямейства трэба толькі гадзін пяць у дзень, каб нагатаваць ежы. Святлана згаджаецца: «Так, гэта самая складаная частка хатняй работы. Я сама вінаватая, крыху іх распесціла. Няма такога, каб прыгатаваў адну страву, і ўсе елі. У кожнага свае перавагі і густы. Напрыклад, учора патушылі гуся — у лепшым выпадку яго паядуць двое з пяці дзяцей. І гарніраў трэба некалькі адразу, бо адзін любіць бульбу, другі макарону, а трэцяму рыс давай. Нават з макаронай трэба дагадзіць, бо аднаму хочацца спагеці, другі любіць ракушкі. Спадзяюся, як падрастуць, усё гэта неяк вырашыцца.

**«Яна непапраўны эксперыментатар, аднойчы нават перапёлак вывела ў сваім інкубатары. Са звычайных, дарэчы, яек, тых, што прадаюцца ў краме».**



**«Гарніраў трэба некалькі адразу, бо адзін любіць бульбу, другі макарону, а трэцяму рыс давай. Нават з макаронай трэба дагадзіць, бо аднаму хочацца спагеці, другі любіць ракушкі».**

— Выгод у хаце пакуль няма, — працягвае гаспадыня. — Для мыцця пабудавана лазня ў двары, машынка пральная ёсць. Некаторыя цяпер бялізну не прасуюць для эканоміі часу, а я не магу, па-мойму, непрасаваная бялізна нейкая няправільная. Гэта ўжо работа на позні вечар, калі на іншае сіл не застаецца.

## УСЕ РАЗАМ

А дзеці — з імі вялікіх клопатаў няма, цягнуцца адзін за адным у вучобе. Старэйшы Віктар зараз у выпускным класе. Адзіная дачушка Ксенія ў сёмым, Арсень — трэцякласнік. А малыя пакуль дома. Калі мама выйдзе на працу ў мясцовую школу, тады і яны пойдуць у садок.

Ксенія сур'ёзна займаецца музыкай па класе баяна. Бацька возіць яе кожны дзень у музычную школу ў пасёлак, наперадзе ў яе першы конкурс, дзяўчынка хвалюецца. Яна ж не без гонару паказала мне ордэн Маці, якім мама была ўзнагароджана зусім нядаўна.

— Ты, дачушка, таксама, можа, калі-небудзь атрымаеш такую ўзнагароду, — усміхаецца мама.

— Не, — сур'ёзна адказвае Ксюша, — у мяне крыху іншыя планы на жыццё.

— Што ж, у кожнага сваё, — згаджаецца матуля. — Можа, яшчэ перадумае, але мы будзем паважаць выбар кожнага з дзяцей. А вось Арсень, прынамсі, пакуль абяцае прадоўжыць нашу справу. Кажа: «У мяне будзе вялікая сям'я, я стану фермерам, буду шмат працаваць, а ты, мама, будзеш сядзець у крэсле-качалцы і падлічваць грошы». Мы смяёмся: «Твае б словы, сынок, ды Богу ў вушы». Галоўнае, каб добрымі людзьмі ўсе выраслі, каб працы не баяліся, а якую дарогу выбера кожны, якую прафесію, не так і важна.

У нас ніколі не бывае сумна. Калі надыходзяць святы, усе разам збіраемся за сталом, гатаваць я люблю. Абавязкова нешта арыгінальнае на дні нараджэння пячом. Любім разам адпачываць, хоць далёка не выберашся з такой гаспадаркай. А вось у розных раённых сямейных мерапрыемствах, калі запрашаюць, з задавальненнем прымаем удзел. Ужо неаднойчы нас адзначалі рознымі дыпломамі, падарункамі. Усе разам можам выйсці на сцэну, загадзя рыхтуем прэзентацыю сям'і ці выставу ўласных вырабаў.



Дзяцей работай па гаспадарцы не нагружаем. Хіба што катоў і сабак даручаем дагледзець — сабакі чатыры, трое катоў. Але ж усе разам выходзім на так званыя суботнікі, калі трэба прыбраць падворак, навесці парадак на гаспадарчым двары. Любую работу робім з задавальненнем.

Святлана Віктараўна, педагог па адукацыі, лічыць, што ў сям'і галоўнае — навучыць дзяцей любові і павазе, быць прыкладам у працы, а астатняе само «вымалюецца».

**Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.**
*Івацэвіцкі раён.*

# «Не існуе толькі чорнага і белага»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

У той бальніцы быў пакладзены пачатак і серыі маіх кніг на ваенную тэматыку. Кропкай адліку стала адна выпадковая сустрэча. Падчас начных дзяжурстваў я любіў сядзець на падаконні і глядзець на Сафійскі сабор. І вось у адну з начэй да мяне падышоў пацыент, які ляжаў у нас пасля інфаркту. Мы разгаварыліся. Ён пачаў распавядаць пра сваё дзяцінства ў Полацку 1940-х гадоў. Я слухаў і час ад часу нешта пазначаў. Тады і нарадзілася гісторыя, якая пасля перарасла ў кнігу «Вайна дзяўчынкі Сашы», а ў працяг выйшла «Вайна за нашымі вокнамі». Цяпер пішу трэцюю — «Зорка над сэрцам», з падрыхтоўкай якой мне дапамагае Барысаўская бібліятэка. Гэта будуць гісторыі Барысаўскага гета.

***— Вы сам тата, таму хачу запытаць, з якога ўзросту і як варта гаварыць з дзецьмі пра вайну?***

— Гаварыць трэба адназначна. Мы сёння жывём у свеце, дзе войны, на жаль, паўсюль і ніколі не заканчваюцца. Таму і з дзецьмі, мяркую, з першых класаў варта пачынаць весці размовы пра тое, што адбываецца навокал. Акуратна, з пазіцыі дзіцяці, яго ўзросту. Не трэба хаваць ад дзяцей праўду. Малыя ўсё здольныя зразумець. Нельга толькі казаць, быццам немцы, румыны і ці іншая нацыя дрэнныя. Няма дрэнных нацый, ёсць дрэнныя людзі і з'явы.

У мяне, напрыклад, шмат сяброў у Германіі. І, прыязджаючы да іх, я запытваў, як яны ставяцца да ваеннай тэмы мінулага? Яны кажуць, што гэта ганьба для нацыі, — быць ініцыятарамі дзвюх сусветных войнаў. А вось у іх сучаснай моладзі ўжо іншае ўспрыманне той тэмы. Таму ў размове з дзецьмі нам варта дакладна і правільна расстаўляць акцэнты: што не немцы дрэнныя, а сама з'ява нацызму — гэта дрэнна... Не існуе толькі чорнага і белага. Трэба ўзважана і дазіравана размаўляць з дзецьмі пра вайну, расказваць пра яе на прыкладах іх аднагодкаў. Пачаць з гісторыі пра піянераў-герояў, а з узростам можна ўжо іншыя прыклады прыводзіць для разважанняў.

***— Давайце вернемся да літаратуры. Ці часта вам трапляюцца кнігі, сюжэт якіх не хочацца змяняць?***


Фота Лізаветы ГОЛАД.
Дачка Соня — татава натхняльніца.

— Я чытаю па тры кнігі на тыдзень. І ў большасці выпадкаў мяне цалкам задавальняе, як заканчваецца гісторыя. Безумоўна, я перапісаў бы «Гульню прастолаў». Пісьменнікі вельмі любяць пакідаць адкрыты фінал. Але ў такіх выпадках чытач мае вялікую прастору для фантазіі...

***— А прачытаныя кнігі не перашкаджаюць пры напісанні ўласных твораў?***

— У мяне ніколі не ўзнікае спакусы запазычыць штосьці ў іншых пісьменнікаў. Адзінае, баюся, што магу зрабіць гэта нават не ведаючы. Бо за свае 43 гады прачытаў шмат кніг, і ў сітуацыі, калі здаецца, што прыдумаў класны сюжэт, можа здарыцца, што ў нечым ён нагадвае адзін з прачытаных раней. Думаю, запазычанне ў пісьменнікаў здараецца, але не наўмысна. Я не магу сказаць, быццам прачытаныя кнігі перашкаджаюць мне пісаць. Наадварот, я вучуся лепш бачыць майстэрства аўтара. І наадварот, недахопы.

***— У вас бываюць моманты стамлення ад напісання кніг, страх «чыстага аркуша»?***

— Пакуль не здараліся, дзякуй богу. Звычайна пісьменнікі ствараюць кнігі ў пэўным стылі, а я маю магчымасць працаваць у некалькіх розных напрамках. Калі адчуваю, што стаміўся пісаць пра медыцыну, магу пераключыцца на фэнтэзі, а потым адкласці гісторыю і вярнуцца да ваеннай тэмы. Такое пераключэнне і дазваляе не выгараць. Не ўспрымаю працэс напісання кніг як руціну, бо не прымушаю сябе пісаць, а раблю гэта з задавальненнем.

Гісторыі знаходзяць мяне ў самых нечаканых месцах. Часам еду ў камандзіроўку, сустракаю закінуты дом, а праехаўшы яго, спыняюся і накідваю, што там магло б адбывацца, а дома ўжо з усяго хаосу ствараю адзінае апавяданне. За гады, што пісаў «у стол», у мяне назапасілася вялікая колькасць нататак. Нават калі не буду нічога прыдумваць, то ўсё роўна яшчэ надоўга хопіць матэрыялу.

***— А што адчувае пісьменнік, калі бярэ ў рукі сваю першую надрукаваную кнігу?***

— Што датычыцца мяне, проста разумею, што трымаю ў руках вынік працы за апошнія дваццаць гадоў. І я не верыў, што змагу гэта паўтарыць. Здавалася, быццам выпадкова ўсё адбылося. Прычым на тую кнігу мы збіралі грошы праз краўдфандынг. Людзі з розных краін свету ўдзельнічалі ў тым, каб мая праца была выдадзена. Таму пісьменнікам я сябе адчуў толькі з выхадам трэцяй кнігі. І цяпер больш і па-сапраўднаму радуюся кожнай новай. І кожную чакаю.

***— Як ваша дачка ставіцца да таго, што яе бацька пісьменнік?***

— Софія таксама ўспрымае гэта як захапленне, але думаю, што ганарыцца мной. Бо для яе жыццё з татам-літаратарам — проста суцэльныя прыгоды, я ж перыядычна бяру яе на нейкія мерапрыемствы. Калі яна была маленькай, то дала мне стымул пісаць для дзяцей. Дачка з'яўляецца галоўнай гераіняй усіх маіх дзіцячых кніжак. Калі я спрабую ствараць гісторыю пра хлопчыкаў, то галоўным героем уяўляю сябе, а ў выніку — атрымліваецца... дзіцячыя апавяданні з драматычным сюжэтам.

***— Зараз ваша дачка перажывае падлеткавы ўзрост. Цяжка быць татам падлетка?***

— У нас з Софіяй даверлівыя адносіны. І я і сёння магу прыдумаць ёй гісторыю перад сном. Але пры гэтым мая дачка ўжо спартсменка (займаецца дзюдо), з характарам, да яе трэба шукаць падыход і лічыцца з ёй. Калі нешта для сябе вырашыла, то ніякія ўгаворы не дапамогуць змяніць яе погляду. Няхай увесь свет пачакае!

Калі задумацца, то дзеці часта маюць рацыю ў тым, што адстойваюць сябе. Напрыклад, ну каму будзе дрэнна, калі вы кудысьці спозніцеся? Вам нязручна перад настаўнікам, выхавацелем, перад светам? Атрымліваецца, мы свядома выхоўваем чалавека, які будзе падпарадкоўвацца іншым, абставінам... А дзеці жывуць з пазіцыі, што навакольны свет існуе для іх. Тая ж сучасная моладзь — не «дрэнная», а проста больш упэўненая ў сабе. Як бацька я ўвогуле пераканаы, што самае галоўнае, каб дзеці былі здаровыя, а ўсё астатняе ўжо другаснае. Па сабе ведаю, што выдатнікі ў школе неабавязкова потым становяцца паспяховымі ў дарослым жыцці. І таму місія бацькоў заключаецца ў тым, каб не ламаць нашых дзяцей, а навучыць іх разуменню, што, акрамя правільных адказаў, могуць быць і іншыя варыянты ў вырашэнні нейкай сітуацыі.

***— Мець даверлівыя адносіны з уласным дзіцем і быць для яго аўтарытэтам — адно і тое ж?***

— Для мяне гэта зусім розныя рэчы. І, магчыма, я ў гэтым сэнсе паводжу сябе няправільна, бо з Софіяй будую адносіны як сябар. А класічны вобраз бацькі — гэта звычайна які? Ён сказаў, а дзіця падпарадкоўваецца. Я не хачу такога фармату ўзаемадзеяння. Мне сумна быць побач з дачкой дарослым. Хоць я і бацькоў разумею, ім цяжка, яны стамляюцца і ўжо зусім нічога не хочуць па вяртанні дадому. Але па сабе ведаю, што дзіця можа быць для дарослых добрым стымулам для самаўдасканалення. Напрыклад, мая дачка, якую я прывёў у басейн у два гады, цяпер займаецца спортам і пры гэтым бачыць, што і тата не ляжыць на канапе, а штангу цягае. Трэба быць прыкладам для сваіх дзяцей, а не імкнуцца рэалізоўваць у іх свае няздзейсненыя жаданні.

***— Пісаць дзіцячыя творы вы пачалі, прыдумваючы гісторыі для сваёй дачкі. А як бацькам выбраць вартыя кнігі для дзяцей з усёй разнастайнасці прапаноў?***

— Найперш, раіў бы самім чытаць тыя кнігі, якія збіраецеся даць у рукі сваім дзецям. Мне проста незразумела, як можна інакш. У тых кнігах, якія прапаноўваю Софіі, я ўпэўнены ў кожным слове, хоць не выключаю, што ў інтэрнэце яна знаходзіць нешта сама. Гэта добра і нармальна. Таму што сучаснаму дзіцяці не прапануеш «Нязнайку на Месяцы». Яны ў большасці сваёй такую кнігу проста не зразумеюць. Але разам з тым у любым творы дзеці знойдуць нешта сваё.

***— А наколькі патрэбны дзецям казкі, фантастыка?***

— Патрэбны, таму што гэта спрыяе развіццю фантазіі, творчага мыслення. На жаль, сёння дзеці менш мараць, бо амаль усё маюць, лічыце, у крокавай дасягальнасці. А фантазія нараджаецца ў «галадзе» ўспрымання. Сучасныя дзеці маюць безліч магчымасцяў пабачыць свет, спазнаць жыццё. Можа, у гэтым ёсць пэўныя мінусы альбо наадварот — яны прыдумаюць нешта на парадак лепшае? Чытайце разам, абмяркоўвайце прачытанае, аднак і будзьце гатовыя да таго, што 12-гадовае дзіця не скажа вам шчыра, што яно думае пра кнігу і яе герояў. Але калі падзеліцца, то бацькам будзе цікава зірнуць на звыклае ў новым святле.

***— Пра што цяпер хочаце напісаць для падлеткавай аўдыторыі?***

— Разам з Выдавецкім домам «Звязда» мы працуем над выданнем літаратуры ў жанры фэнтэзі. Я пачаў рабіць заметкі такога жанру, калі закахаўся ў сваю будучую жонку. У мяне наспеў вялікі цыкл з 26 кніг, які чакае свайго часу. Першыя тры кнігі выйшлі, зараз рыхтуецца да выхаду чацвёртая. Плюс яшчэ маю шмат гісторый, якія прыдумаў, калі сам быў падлеткам. Прыйдзе час, дастану іх і, магчыма, дам новае жыццё. Пакуль чытачам падабаюцца мае кнігі, я працягваю іх пісаць.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з архіва Паўла ГУШЫНЦА.**

# Танцуюць усе!

**Конкурс аб'яднаў аматараў харэаграфіі ад 5 да 75 гадоў. Удзельнікі выйдуць на сцэну канцэртнай залы «Мінск» 8 красавіка**

**Адкрыты рэспубліканскі конкурс «Час танцаваць» пройдзе сёлета другі раз і дасць магчымасць пазмагацца за Гран-пры ў памеры 200 базавых велічынь — значная сума, якую можна будзе скарыстаць на развіццё танцавальнага калектыву. У адборачным туры прынялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў Беларусі: тут і аматарскія калектывы, і навучэнцы школ мастацтваў, і студэнты, і проста людзі, захопленыя танцам. Праект сацыяльнага значэння скіраваны на падтрымку і развіццё харэаграфічнага мастацтва. А калі разабрацца, то значнасць тут асаблівая: людзі розных узроставых катэгорый, якія любяць танцаваць, маюць магчымасць праявіць сябе і атрымаць пэўную ўвагу. Каб максімальна задзейнічаць ахвотных, у конкурсе прадугледжана сем намінацый — ад класічнай да сучаснай харэаграфіі і альтэрнатыўных кірункаў. Арганізатарам конкурсу «Час танцаваць» з'яўляецца Рэспубліканскі культурна-асветны цэнтр Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Беларусі.**

— Конкурс выклікаў жывы інтарэс удзельнікаў. Праведзена дасканалая работа па адборы, у выніку можна будзе пабачыць каля 40 калектываў з розных рэгіёнаў, якія аб'ядноўваюць людзей ад 5 да 75 гадоў. Найбольш шырока прадстаўлена катэгорыя ад 5 да 16 гадоў. Вялікая колькасць калектываў са званнем «заслужаны аматарскі калектыў». Адгукнуліся спецыяльныя навучальныя ўстановы — Універсітэт культуры і мастацтваў, школы мастацтваў. Наперадзе конкурс, які будзе доўжыцца 12 гадзін у рэжыме нон-стоп. Таму самая істотная праблема — час. Разумеем, наколькі складана за тры хвіліны ацаніць калектывы, якія рыхтуюцца гадамі. Асаблівасць конкурсу сёлета ў тым, што чакаецца высокі ўзровень удзельнікаў, — адзначыў **Аляксандр СІДАРЭНКА, дырэктар дзяржаўнай установы «Рэспубліканскі культурна-асветны цэнтр» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.** — Але наша работа не будзе спыняцца выключна на конкурсе. Мы разглядаем магчымасць правядзення бясплатных майстар-класаў для кіраўнікоў, якія працуюць з харэаграфічнымі калектывамі, дзеля павышэння ўзроўню іх падрыхтоўкі. Разумеем, наколькі складана весці работу ў рэгіёнах. Так, ёсць падрыхтаваныя педагогі са спецыялізаванай адукацыяй, а ёсць і самародкі. Але мы кажам пра сістэму работы дзеля павышэння творчага майстэрства танцавальных калектываў.

Як адзначаюць арганізатары, самыя масавыя намінацыі — народны і эстрадны танец. Але конкурс адкрыты — у тым ліку для ўдзельнікаў з іншых краін. Сёлета праз адбор прайшла адна ўдзельніца з расійскага Яраслаўля. Магчыма, у будучым колькасць удзельнікаў з розных краін павялічыцца. І тым не менш — конкурс «Час танцаваць» найперш рэспубліканскі, у ім зроблены акцэнт на творчыя калектывы нашай краіны.

А калі мы кажам пра выбар найлепшага для ўручэння Гран-пры, то маецца на ўвазе ўсё ж творчае спаборніцтва. Нехта павінен стаць лепшым — і гэта вызначыць журы на чале са Святланай Гуткоўскай, загадчыцай кафедры харэаграфіі, прафесарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Адзін з сяброў журы **Аляксей КІСЯЛЁЎ, харэограф-пастаноўшчык, чэмпіён свету ў намінацыі «Шоу», педагог вышэйшай катэгорыі Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў,** растлумачыў:

— Гэта рэспубліканскі конкурс высокага ўзроўню, ён адбываецца ў добрай зале, дзе прафесійнае святло і гук, ёсць памяшканне для перапранання, магчымасць харчавання на месцы, што вельмі зручна для ўдзельнікаў. Гэта шанц праявіць сябе: у конкурсе шмат намінацый, ён прадстаўляе мноства жанраў і відаў танцавальнага мастацтва. Для калектываў адно конкурснае выступленне замяняе дзесяць звычайных трэніровак. Дзеці, якія прайшлі праз конкурс, пасля танцуюць значна лепш. Таму конкурс важны ў творчым працэсе.

З гэтым пагадзілася **Ірына ДАРОХІНА, дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Дзіцячая харэаграфічная школа мастацтваў № 1 г. Мінска», заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, кіраўнік узорнага ансамбля танца «Вясёлушка»:**

— Для мяне як чалавека, які 40 гадоў аддаў адукацыі ў галіне харэаграфічнага мастацтва, вялікі гонар удзельнічаць у дадзеным конкурсе. Яшчэ да таго як наша школа набыла харэаграфічную спецыялізацыю, для мяне было важна ўменне прачытаць музыку. Таму што танец — гэта малітва ўнутры сябе, мы вучым выяўляць тое, што адчуваем. Сёння ў краіне шмат платных конкурсаў. А ў нашай школе больш за 100 дзяцей са шматдзетных сем'яў, бацькі якіх не заўсёды маюць магчымасць накіраваць дзіця на такія конкурсы. Цяпер у дзяцей ёсць магчымасць паказаць сябе. А мы, кіраўнікі творчых калектываў, таксама атрымліваем стымул, бо рыхтуем будучыню нашай краіны.

Генеральным партнёрам конкурсу стаў «Беларусбанк», які не першы год падтрымлівае праекты па развіцці культуры і мастацтва і бачыць у гэтым сваю сацыяльную адказнасць.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# «ЕЖА — АПОШНЯЕ, НА ЧЫМ ТРЭБА ЭКАНОМІЦЬ»

**Што абавязкова павінна быць вясной на нашай талерцы? Навошта складаць меню на месяц? Што трэба выкінуць з кухні ў першую чаргу? Як адну качку расцягнуць на цэлы тыдзень? Што можна прапанаваць дзецям замест шкодных чупа-чупсаў ды хот-догаў? Пра гэта і не толькі паразмаўлялі з фуд-коўчам Ксеніяй ВЯЦКАЙ.**

## ПРА ЛІМОННЫ КЁРД ДЫ ХЛЕБНУЮ КАРТУ

**Я толькі нядаўна даведалася, што мая бабуля па мамінай лініі пры ўсіх яе высокіх пасадах нейкі час працавала буфетчыцай.** А дзядуля лічыўся самым запатрабаваным млынаром у рэгіёне. Таты бацькі таксама былі звязаны з ежай. Бабуля працавала тэхнолагам піўнога завода, дзядуля — макароннага. У іх дома заўсёды стаяў хлебны квас. Ён быў проста ідэальны, насычанага цёмнага колеру. Мне пакуль не ўдалося яго паўтарыць. Так што браджэнне і мука — гэта мае радавыя, генетычныя коды.

**Мне падабаецца дарыць і атрымліваць у падарунак незвычайную ежу.** Гэта цудоўны знак увагі. Калі я была маленькай, у бацькоў было шмат камандзіровак, і адусюль яны мне прывозілі штосьці такое, што я ніколі не каштавала. Дагэтуль памятаю, як упершыню ела халву ў шакаладзе, якую мама прывезла з Масквы. Ці як тата прывёз з Лондана слоічак лімоннага кёрду. Дарэчы, раю зрабіць гэтую смакату на велікодны стол. Робіцца яна вельмі проста. Натрыце цэдру трох лімонаў і выцісніце сок у шкляную міску. Дадайце чатыры жаўткі, паўшклянкі цукру і пачніце варыць крэм на вадзяной лазні (ці ў таўстасценнай каструлі, пастаянна памешваючы). Калі крэм загусцее — дабаўце 100 грамаў сметанковага масла і актыўна ўмяшайце яго ў кёрд. Пераліце ў слоічкі і пастаўце на ноч у халад. Кёрд можна рабіць з любой сезоннай садавінай і ягадамі.



**Мой прынцып: на ежы ніколі нельга эканоміць, бо яна — аснова жыццёвай сілы.** Недарэмна яшчэ Гіпакрат казаў: «Ты — гэта тое, што ты ясі...» Не сакрэт, што няякасная ежа можа стаць прычынай многіх хвароб.

**У мяне ёсць моцнае жаданне карміць людзей якаснай фермерскай ежай, каб маім дзецям хапіла здаровых нявест і жаніхоў.** Гэта адна з прычын, па якой восем гадоў таму мы з мужам заснавалі таварыства фермераў і гастраэнтузіястаў Беларусі. Стварылі каталог фермераў з усёй краіны, у якім кожны пры жаданні можа знайсці свайго — таго, хто яго будзе карміць. Я перакананa, што паўсюль рэальна выбудаваць сваё жыццё так, каб фермерскія прадукты можна было б знайсці ў радыусе 30 кіламетраў вакол сябе. Акрамя таго, штотыдзень у Мінску працуе рынак фермераў і гастраэнтузіястаў, ужо тры гады мы не прапускаем ніводнай суботы. Туды прыязджаюць каля 50-60 фермераў з усёй краіны. Яшчэ адзін наш цудоўны праект «Хлебная карта Беларусі», куды нанесены хлебапёкі з іх кантактамі. Калі ў вас, дапусцім, бацькі жывуць не пабач, вы можаце заказваць ім хлеб у мясцовых хлебапёкаў. Прынамсі, я так раблю для свайго таты. Ён жыве ў Жодзіне, і там ёсць жанчына, якая пячэ для яго хлеб штотыдзень і адвозіць.

**Я люблю ездзіць па Беларусі і каштаваць мясцовую ежу.** На Палессі, напрыклад, непараўнана запякаюць рачную рыбу на саломе па старажытнай традыцыі. Акрамя таго, мне падабаецца ўзбітая і прыгатаваная ў печы ікра шчупака ці судака ў маленькіх гаршчочках. Заўсёды заходжу на мясцовыя міні-рынкі, скупляю там усё — нават калі мне гэта не трэба, толькі таму, што проста падабаецца кантактаваць з людзьмі, і я паважаю іх за тое, што яны знаходзяць у сабе сілы ўсё гэта вырабляць. Я заўсёды падтрымаю мілую жанчыну, якая прадае дамашнюю каўбасу, бо мне прыемней купляць прадукты «з рук» у таго чалавека, які іх вырасціў, прыгатаваў. Як бы гэта дзіўна ні гучала, але ў кожнай каўбасы, сыру, хлеба павінен быць свой твар.

**Тое, што фермерскія прадукты даступныя далёка не ўсім, — гэта міф.** Пажыўная каштоўнасць дамашняга сыру, хлеба, мяса вышэйшая, чым прамысловых. Калі крамавых катлет аднаму чалавеку трэба, каб наесціся, 3-4 штукі, то з дамашняга мяса дастаткова з'есці адну-дзве. І менавіта на колькасці адбываецца поўнае ўраўнаванне цэн. З іншага боку, мала хто звяртае ўвагу, што тыя ж жуйкі ды чупа-чупсы, якія прадаюцца ў краме, у пераліку на кілаграмы каштуюць нашмат даражэй, чым дамашняя яблычная ці ягадная пасціла ды цукаты, якія прадаюцца на крафтавым фермерскім рынку. У чалавека заўсёды ёсць выбар. І гэта ні ў якім разе не пытанне грошай.

## ПРА КЛЯНОВЫ СІРОП ДЫ САЛАТУ З ДЗЬМУХАЎЦА

**Большасць крафтавых прадуктаў расце зусім бясплатна на нашай зямлі.** Ідзі ды збірай. Травяныя чаі я, напрыклад, наогул не купляю. Мы з дзецьмі за сезон сабе нарыхтоўваем столькі, што нават прадаём лішкі. Хутка ў лесе з'явяцца смарчкі — самыя дарагія грыбы ў свеце, яны стаяць у адным шэрагу з труфелямі.

**Каб павысіць імунітэт, многія блогеры рэкамендуюць уключыць у свой рацыён БАДы.** Я ж прынцыпова не ўжываю штучных вітамінаў. Бо перакананa: усё, што нам трэба, ёсць у ежы. Вясну мая сям'я пачынае са збору кляновага і бярозавага соку. Сёлета я абавязкова паспрабую зварыць хоць бы кубачак дамашняга кляновага сіропу.

**Як толькі прачынаецца прырода, мая бабуля штодзень па дарозе з царквы прыносіць жменю нейкіх дзікаросаў для салаты.** Падарожнік, крапіва, сніткa, макрыца, лісце дзьмухаўца... Лепш за салату з дзьмухаўцом, варанымі яйкамі і смятанай можа быць толькі салата з чарамшой. З прыходам вясны пачынаецца перыяд эканоміі: мы можам усё больш ежы здабываць самастойна. Можна нават скласці меню так, каб маладая зяляніна станавілася асноўнай ежай. Смузі са сніткай і кветкамі дзікай фіялкі на сняданак, зялёны боршч з крапівой на абед, равіёлі з дзікаросамі на вячэру — гэта ж свята.

**Я супраць таго, каб эканоміць на ежы, але за яе рацыянальнае выкарыстанне.** Раю складаць меню на тыдзень, месяц, як каму зручна. Калі вы дакладна прапісваеце, што будзеце гатаваць, то адпаведна не здзейсніце пустых пакупак.

**Важна ведаць, якія прадукты цяпер у сезоне, бо сезонныя прадукты заўсёды каштуюць максімальна танна.** Напрыклад, навошта страчваць грошы на даражэнныя памідоры ў сакавіку, калі можна завітаць у найбліжэйшы лясгас і купіць бярозавага соку — ён каштуе ўсяго 30 капеек за літр. У свежым бярозавіку адназначна будзе больш вітамінаў, чым у прывазных памідорах. Акрамя таго, бярозавы сок можна заквасіць з паленым жытам і разынкамі ці закатаць. Я адмыслова зрабіла 12 кулінарных газет аб сезоннай ежы, у якіх ёсць спіс сезонных прадуктаў на кожны месяц года: калі што расце і што з іх можна прыгатаваць. У кожнай газеце — 15-30 рэцэптаў. У прынцыпе гэтага дастаткова на месяц, каб максімальна разнастаяць свой рацыён.



**У кожнага прадукту ёсць рэсурсныя спосабы выкарыстання.** Напрыклад, я звычайна купляю цэлую фермерскую качку. Яна каштуе 30-40 рублёў. Запякаю яе — і атрымліваю паўнавартасны абед на вялікую сям'ю. З качкі застаецца тлушч, які пасля запякання я пераліваю ў слоік. І смажу на ім бульбу, катлеты, яйкі. А мы ведаем, што качыны ды гусіны тлушч самы каштоўны, у ім шмат карысных рэчываў. Пасля таго як усе паелі мяса, застаюцца косткі. Я іх збіраю і потым вару вялікую каструлю смачнага навapыстага булёну. На аснове яго потым яшчэ гатую кашы, тушу бульбу, раблю соусы. Боршч на качцы — наогул цудоўны. У выніку адна качка можа разысціся на цэлы тыдзень, а можа нават і на 10 дзён паўнавартаснай ежы. На Вялікдзень я звычайна запякаю нагу барана. Націраю яе буйной соллю, молатымі перцамі і кладу ў пакет для запякання. Прысыпаю шчодра размарынам і завязваю пакет. Запякаю гадзіну пры 180-200 °С, затым гадзіны тры тамлю пры 100 °С і ўжо ў самым канцы, калі не атрымалася корачкі, прыпякаю на 220 °С хвілін дзесяць. Гэта страва ў нашай сям'і сімвалізуе канец посту.

**З кухні раю ў першую чаргу выкінуць крамавы раслінны алей, бо ў ім нуль карысці.** І як вынік — павышэнне халестэрыну. Таму я смажу на тлушчы ды на топленым сметанковым масле. Для запраўкі салатаў выкарыстоўваю сыравыціснутыя алеі.

## ПРА 60 КУРЭЙ ДЫ ЦУКАТЫ З ГАРБУЗА

**Хоць мы жывём у вёсцы, але фермерствам я пакуль займацца не планую.** Мой досвед паказвае, што гэта дадзена не кожнаму. У нас пасля таго, як пераехалі жыць у вёску, было ўжо больш за 60 курэй. Завялі іх не столькі для яек, колькі для радасці ды каб было каму даядаць кашы за дзецьмі. І ўсе яны звяліся: то сокалы, то тхары, то лісы, то яшчэ штосьці. Таму сваёй задачай я бачу натхняць іншых займацца фермерствам, падтрымліваць гэтых працавітых людзей, дапамагаць ім прадаваць свой тавар.

**Пасля таго як я наведала майстар-клас па варцы сыру ў адных беларускіх сыравараў** і мы некалькі гадзін цягалі цяжкія каструлі з сыроваткай, абпальваючы рукі, я зразумела наколькі гэта цяжкая праца. І я такая шчаслівая, што ёсць людзі, якія вараць яго, а таксама вырошчваюць тыя ж самыя агуркі, памідоры, бульбу, месяцамі паліваюць іх, праполваюць, акучваюць, падвязваюць — і ўсё гэта для таго, каб гэта не рабілі мы з вамі, а мелі магчымасць купіць.

**Мы ўжо каторы год купляем оптам на год фундук і грэцкія арэхі ў беларускага фермера.** Дарэчы, арэхі лепш набываць у шкарлупіне і чысціць па меры неабходнасці. Па-першае, гэта нашмат танней, чым чышчаныя. Па-другое, у шкарлупіне арэхі не так псуюцца. Ад доўгага ж ляжання ў пачышчаных арэхах можа з'явіцца мікрацвіль. Па-трэцяе, падчас чысткі арэхаў у дзяцей развіваецца дробная маторыка.

**Двое маіх старэйшых сыноў уваходзяць у перыяд пубертату.** Яны, як і большасць падлеткаў, не асабліва клапоцяцца, што скажуць мама з татам наконт таго, што яны ядуць. На свае кішэнныя грошы набываюць тое, што і аднакласнікі, — чыпсы, «Кірыешкі». Я да гэтага стаўлюся абсалютна спакойна (перакананa, што яны гэта перарастуць), бо ведаю: дома яны ядуць якасную ежу. У старэйшага сына з'явілася каханне. Ён пайшоў да гэтай дзяўчынкі ў госці, а яна кажа: «Ой, Марк, у мяне ёсць каўбаса. Але яна не дамашняя. Ты, напэўна, такую не будзеш». Калі ён гэта расказаў, мы так смяяліся, бо нават у дзіцячай кампаніі ўсе ведаюць, што нашы дзеці ядуць толькі дамашнія прадукты.

**З сабой у школу мае дзеці бяруць тое, што мы купляем на фермерскім рынку.** Часцей за ўсё яны робяць сабе з вечара гарачыя бутэрброды (якія потым становяцца халоднымі) з дамашніх хлеба, сыру, што плавіцца, і вяндліны, у складзе якой толькі мяса і соль. Акрамя таго, вельмі зручна даваць дзецям з сабой у якасці перакусу арэхі, пасцілу, цукаты. Напрыклад, цукаты з гарбуза — гэта проста топ у нас у гэтым годзе.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

### Топ-5 рэцэптаў з варанымі яйкамі, якія засталіся пасля Вялікадня

***Прапануем самыя простыя і дзейсныя спосабы па выкарыстанні яек ад Ксеніі ВЯЦКАЙ.***

**1. Салата**

Нарэжам свежай зяляніны — ад чарамшы да бацвіння радыскі, дабавім пару вараных яек, лыжку гарчыцы і смятану.

**2. Канверцікі з лаваша**

На тарцы націраем вараныя яйкі, сыр і дадаём зяляніны. Усё гэта выкладваем на квадрацікі лаваша, накрываем другой часткай і падсмажваем на сухой патэльні.

**3. Сэндвіч з яечнай салатай**

Змешваем жаўткі з маянэзам, перцамі і вэнджанай папрыкай, дадаём нарэзаны бялок, лыжку гарчыцы, крыху зялёнай цыбулі, нарэзаны малады агурочак. Выкладваем на хлеб, накрываем такім жа кавалкам зверху і разразаем па дыяганалі.

**4. Фаршыраваныя**

Разразаем яйкі папалам, вымаем жаўток і змешваем яго з: рыбнымі кансервамі і цыбуляй / гарчыцай / адваранымі ляснымі грыбамі / дамашнім маянэзам / крэветкамі / чырвонай ікрой / салёным агурочкам / сырам... І начыняем палавінкі яек. Упрыгожваем зялянінай і спецыямі.

**5. У суп**

Халаднік ды шчаўевы боршч патрабуюць вялікай колькасці яек.

**Приорбанк** RBI Group

**«ПРИОРБАНК» Открытое акционерное общество,**
220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А,

**информирует своих акционеров, что 30 марта 2023 года состоялось годовое Общее Собрание акционеров банка в очной форме**

На Собрании были рассмотрены все вопросы повестки дня:

1. Отчет Наблюдательного Совета банка за 2022 год.
2. Отчет Правления о работе банка за 2022 год.
3. Рассмотрение заключения Ревизионной комиссии по результатам проведения ревизии за 2022 год. Утверждение годовых отчетов, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2022 год; распределение прибыли за 2022 год с учетом заключения Ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
4. Установление размера дивидендов и срока их выплаты.
5. Избрание членов Ревизионной комиссии «Приорбанк» ОАО.
6. Избрание членов Наблюдательного Совета «Приорбанк» ОАО.

По всем вопросам приняты положительные решения.

Выплата дивидендов по привилегированным акциям, установленных в размере 35 копеек на одну акцию, начнется не позднее 06 апреля 2023 года.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 24.02.2023 года. УНП 100220190.*

---

Извещение о проведении открытого конкурса по предоставлению поверхностных водных объектов в аренду для рыбоводства

ЛЕЛЬЧИЦКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
(далее – райисполком)
доводит до сведения заинтересованных юридических и физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей,
**о проведении открытого конкурса по предоставлению поверхностных водных объектов в аренду для рыбоводства, расположенных на территории Лельчицкого района, Гомельской области (далее – конкурс),**
в том числе:

**1. Поверхностный водный объект площадью 13,3 гектара (далее – га), расположенный вблизи д. Усов, Лельчицкого района, Гомельской области, (далее – пруд № 8).**

Размер годовой арендной платы за пруд № 8 в 2023 году составляет 984,20 рубля (девятьсот восемьдесят четыре рубля 20 копеек). В дальнейшем размер арендной платы ежегодно уточняется на основе индекса роста потребительских цен по отношению к декабрю предыдущего года.

Срок заключения договора аренды: 10 лет.

Условия проведения конкурса – лучшие предложения по эффективности использования поверхностных водных объектов, изложенные в обосновании необходимости приобретения и намерений по дальнейшему их использованию. Торги проводятся в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 15 октября 2015 г. № 861 «Об утверждении Положения о порядке проведения торгов по предоставлению поверхностных водных объектов в аренду для рыбоводства».

**Конкурс состоится 10 мая 2023 года в 15.00, по адресу: Гомельская обл., Лельчицкий р-н, г. п. Лельчицы, ул. Советская, 42, кабинет № 110. Организатор конкурса – Лельчицкий райисполком.**

Для участия в конкурсе заинтересованным необходимо представить документы: заявление о предоставлении в аренду поверхностного водного объекта, в котором указываются сведения о поверхностном водном объекте, который заявитель желает получить в аренду. К заявлению прилагаются: копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя, паспорт гражданина или иной документ, удостоверяющий личность, карта-схема поверхностного водного объекта с нанесенными границами, и (или) копия плана местоположения поверхностного водного объекта, план мероприятий по использованию поверхностного водного объекта для рыбоводства, разработанный на срок не менее пяти лет, предложения в письменной форме о выполнении условий торгов, запечатанные в отдельном конверте. При этом данные предложения являются окончательными и не могут уточняться в ходе торгов; копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка; доверенность представителя участника торгов и копия документа, подтверждающего его личность, в случае если заявление подписывается не участником торгов.

Размер задатка составляет 20 процентов от суммы ежегодной арендной платы по объекту, который заявитель желает получить в аренду. Сумма задатка, не позднее 3 мая 2023 года, перечисляется на внебюджетный счет райисполкома BY89 AKBB 3641 4210 0003 5300 0000, в ЦБУ № 315 ОАО «АСБ «Беларусбанк», УНП 400032854, BIC AKBBBY2X, назначение платежа – «плата за право заключения договора аренды поверхностных водных объектов». Участникам, не победившим в конкурсе, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней после проведения конкурса.

Возмещение затрат райисполкому на организацию и проведение торгов осуществляется участником торгов, выигравшим торги. Размер такого возмещения не должен превышать суммы фактических затрат на организацию и проведение торгов, разработку документации, необходимой для их проведения. Информация о затратах, порядке и сроках из возмещения в обязательном порядке доводится до сведения участников торгов до начала их проведения по объекту, выставляемому на торги.

Споры о порядке проведения торгов разрешаются комиссией.

Адрес и номер телефона члена комиссии: Гомельская обл., Лельчицкий р-н, г. п. Лельчицы, ул. Советская, 42, кабинет 110, тел. (802356) 50191.

